Спявачкі з Чаромхі→3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Дзмітрыю Шатыловічу—85! →12

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 46 (2896) Год LVI | Беласток, 13 лістапада 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Падляшскія хронікі ў Тымянцы

Марыя Тэрэбун уздыхнула з палёгкай:

— Ну, хваліці Бога, якось прыйшла, дала рады.

І, падпершыся на кульбаку, спытала:

— А вы то адкуль прыехалі?

— З Беластока.

— А ў мяне ўнукі ў Беластоку, — уцешылася бабуля і пачала называць іх імёны.

Думкі вясковых жанчын заўсёды пры гарадскіх унуках і праўнуках. Вось у Марыі Тэрэбун, 82-гадовай пенсіянеркі з Тымянкі, пяць праўнукаў і чатырнаццаць унукаў. Па *цэлым* свеце, значыць, у Польшчы і ў Амерыцы...

— Усякіх прыждалася, — кажа, — і *рускіх,* і польскіх.

Дзіўна размаўляць мне ў састарэлай і прыхаванай ад свету Тымянцы пра гарадскіх дзяцей. Іх успамін быццам запаўняў тут вольныя месцы, бо маладых і дзяцей як паветра не хапае ў вёсцы. Няма для каго пячы булкі, няма каму спяваць калыханкі, апавядаць казкі.

— Адзін тэлевізар астаўся, — уздыхае Марыя Тэрэбун.

* * *

Ірэна Яношук што і раз выбягала са святліцы паглядзець на дрогу. Ці хоць на час з'едуцца калектывы? Ці зыдуцца людзі з вёскі? Дырэктар Гміннага цэнтра распаўсюджвання культуры ў Нурцы-Станцыі гэтую сустрэчу перажывала ў асаблівы спосаб.

— Бо я сама родам з Тымянкі.

Два гады не было ў вёсцы імпрэзы. У летні сезон немагчыма іх арганізаваць, бо ўсе нядзелі распісаны і заняты пад розныя мерапрыемствы. А восенню, калі ўсё абціхне, добра пасядзець разам з людзьмі, паўспамінаць мінулае, паспяваць свае песні. Яны — асалода на хворую старасць.

— А ведаеце як са старэйшымі людзьмі бывае, не кожны дасць рады на сваіх нагах дабрацца, — дадае спадарыня Ірэна. Апошняя заўвага датычыла старажылаў, якіх на машынах давезлі ў святліцу ўжо гарадскія дзеці і ўнукі...

Ірэна Яношук рада, што ўдалося ёй крыху *раскруціць* гміну. Вось у апошнія гады і ў іх з'явіліся вакальныя калектывы. Сёння, апрача беластоцкай моладзі, прыедуць паспяваць „Вжосы" з Вілінава, „Крынічкі" з Радзілаўкі і „Незабудкі" з Нурца-Станцыі. А з беластоцкімі акцёрамі было так. Тут прыслужыўся адзін вучань, унучак Рыгора Баены з Машчоны-Панскай. Ён вучыцца ў беластоцкай „чацвёрцы". Праз іх сям'ю запрасілі *спектакль.*

* * *

Дзесяць хвілін да спектакля ў *царскую святліцу,* як называюць у вёсцы клуб, пачалі сходзіцца людзі. Сярод грамады энергічна крочыў мужчына ў капелюшы.

Ірэна Яношук вітае беластоцкую моладзь

Мікола Кірылюк

— Файны ў вас капялюш! — хвалю за стыль.

— Я солтыс, таму і капялюш мусіць быць файны, — жартуе Мікола Кірылюк. І апавядае пра гісторыю мясцовасці. Калісь тут было Тымянова. У вёсцы быў двор, царква, школа. Напярэдадні *бежанства* царкву разабралі і перавезлі ў Пяшчатку. Пры сацыялізме сяло трымала яшчэ свой прэстыж. У Тымянцы працавала Грамадская рада, школа, пошта, тры магазіны...

— А цяпер усё гасне, — кажа Мікола Кірылюк. — Дваццаць на сто дамоў ужо без людзей.

Прыезд беластоцкай моладзі наклікаў солтысу ўспаміны з мінулага. У лістападзе тут адзначаюць царкоўны фэст на Кузьму і Дзям'яна. Вечарам у святліцы ладзілі забаву. На ўсю аколіцу грымела музыка, з'язджалася моладзь з наваколля...

— А сёння на свята толькі дзе-нідзе ў хатах святло гарыць!

* * *

Для пажылой публікі ў „царскай" святліцы ў Тымянцы спектакль „Ой, даўно-даўно" глядзеўся як асабісты ўспамін. Многія гледачы самі перажылі вайну, прымусовыя работы ў Германіі, пасляваенныя жахі, калі па вёсках хадзілі банды і праганялі *да раю.* Таму на зале панавала крайняя засяроджанасць, людзі ўбіралі кожнае слова, жыва ўспрымалі жарты і разам падспеўвалі песні. У Тымянцы найбольш падабаліся чыжоўскія расказы пра сваты і забавы. Кожнаму выступленню Касі Бялькевіч спадарожнічалі апладысменты і каментары ў стылі: *маладзец!*

— Я так узрушылася, што не дам рады гаварыць, — кажа ўжо пасля выступлення Надзея Карчэўская, мастацкі кіраўнік калектыву „Незабудкі" з Нурца-Станцыі, — амаль цэлы спектакль плакала. Бо ў нашай сям'і падобныя рэчы адбываліся. Ой, файна на маладых падзівіцца. Дай Божа ўсім вам здароўе...

Адразу пасля пастаноўкі Ірэна Яношук павяла беластоцкіх гасцей у кантору частаваць гарбатай, бігосам і пірагамі. На зале ажыўлена размаўлялі пра сям'ю Мазурукоў з недалёкіх Клюковіч. Пра складаны лёс бацюшкі Рыгора Мазурука і матушкі Аляксандры распавяла іх беластоцкая ўнучка Оля Мазурук. Іх імёны на момант ажылі ў памяці мясцовага грамадства ў нядзелю 30 кастрычніка г.г.

Яшчэ ў гэты дзень спектакль „Ой, даўно-даўно" паказалі ў Машчонай-Панскай. Там каля вясковай святліцы чакалі ўжо Ніна і Рыгор Баены ды іх беластоцкі ўнучак Лукаш Лісоўскі.

Ён па-беларуску прывітаўся са сваёй настаўніцай Алінай Ваўранюк і апошнімі гасцямі. Гэты звычайны жэст, па прычыне адсутнасці беларускага школьніцтва тут, на Сямятыччыне, паказаўся незвычайным.

Судзяць беларуса

Гісторыя чалавецтва ведае безліч прыкладаў, калі судзілі невінаватых людзей, калі прысуд быў вызначаны загадзя, дзе юрыдычныя працэдуры служылі толькі афармленнем для ідэалагічнай ці палітычнай расправы дзяржавы над іншадумцамі, над мысляремі, над тымі людзьмі, якія імкнуліся зрабіць грамадства хоць крыху больш справядлівым, прагнулі свабоды для сябе і іншых. Пра ўсё гэта падумалася яшчэ раз, калі ў адзін дзень у Мінску давялося мне патрапіць на суд над нашым праваабаронцам Алесем Бяляцкім. Ізноў судзяць беларуса, літаратара, інтэлігента. Такіх палітычных судоў было нямала ў нашай драматычнай гісторыі за апошнія дзвесцетрыста гадоў, але, калі раней іх ажыццяўлялі прышлыя рэжымы, то цяпер такія расправы адбываюцца ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь. Аднак, падаецца нават сімвалічным, што працэс над Бяляцкім адбываецца ў будынку суда Маскоўскага раёна. Працэс ідзе на чужой расейскай мове, беларускай з асноўных удзельнікаў карыстаецца толькі сам Бяляцкі і пры патрэбе яго адвакат, перакладчыца выглядае недарэчнай фігурай. Працэс, хоць нібыта стаяць мікрафоны, ідзе досыць ціха. Пракурор зусім малады, часам блытаецца, у „палітычных" справах раней заўважаны не быў. Менавіта ён фармулюе дзяржаўнае абвінавачанне і ў разе паспяховага выканання свайго задання атрымае падвышэнне па службовай лесвіцы. Суддзя выглядае больш дасведчаным і ўпэўненым, аднак, адчуваецца, што працэс падрыхтаваны слабавата, многія дакументы не былі перакладзены і падрыхтаваны заранёў. На гэта і іншыя недарэчнасці звяртаюць увагу Бяляцкі і яго адвакат. Прадстаўніцы падатковых органаў сведчаць альбо супярэчліва, альбо нават адназначна на карысць падсуднага — прадстаўленыя ў судзе банкаўскія паперы не могуць быць паўнацэннымі дакументамі і сведчыць пра тое, ці атрымліваў Бяляцкі грошы, ці не. Абвінавачанне рассыпаецца на вачах, доказаў пра тое, што Бяляцкі забіраў сабе грошы, аніякіх. Відавочна толькі адно — праваабарончы цэнтр „Вясна" гэта рэальная арганізацыйная структура, якая дапамагала шматлікім пацярпелым людзям ад свавольства і рэпрэсій уладаў. Менавіта за гэта і судзяць Бяляцкага, у гэтым сапраўдная прычына крымінальнай справы. Але пра гэта прадстаўнікі дзяржавы гаварыць, канешне, не хочуць. Увогуле, увесь працэс выглядае ганебна для дзяржаўных органаў. Літаратара, інтэлектуала, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў трымаюць у жалезнай клетцы нібы нейкага забойцу-рэцыдывіста, перад уваходам у залу і пасля суднага дня яму зашчапляюць за плячыма кайданкі. Усё гэта робіцца для таго, каб прынізіць вядомага чалавека, паказаць іншым прысутным — мы можам з вамі зрабіць усё, што захочам, бо гэта мы — улада, мы — сіла, мы — гаспадары жыцця. Толькі колькі ўжо бачыў свет такіх уладароў, якія скончылі свой шлях ганебна і нікчэмна...

Найбольш у гэтай судовай зале мяне ўразіў персанаж другога плана — міліцыянт, які мусіць пільнаваць парадку ў памяшканні. Яшчэ перад пачаткам пасяджэння гэты маладзён з квадратнай фрызурай і такім жа тварам строгім камандзірскім голасам стаў папярэджваць усіх прыйшоўшых пра тое, як яны мусяць захоўвацца. Глядзеў ён на прысутных журналістаў, дыпламатаў і праваабаронцаў пагардліва. Старэйшага лейтэнанта хутка асадзіў дасведчаны Валеры Шчукін, які паведаміў міліцыянту, што камандаваць у судзе ён не мае ніякага права, а таму хай заткнецца і маўчыць. „Квадратны хлопчык", аднак, і надалей выяўляў ініцыятыву і асабліва пільна адсочваў журналістаў — каб хто чаго не сфатаграфаў лішняга. Нязменны выраз яго твару сведчыў пра адно — гэты выканае кожны загад.

Алесь Бяляцкі і яго калегі, сябры, што былі выкліканы як сведкі, трымаюцца надзвычай годна і цвёрда. Што датычыць ацэнкі таго, што праваабаронца не з'ехаў з Беларусі, а свядома пайшоў на цяжкія выпрабаванні, то тут ёсць розныя меркаванні. Адны лічаць, што Бяляцкаму трэба было б з'язджаць за мяжу і адтуль працягваць сваю дзейнасць, іншыя кажуць, што шлях турмы — гэта адзіны правільны шлях у тым, каб давесці сваю невінаватасць і праўду. Але, што характэрна — усе прадстаўнікі грамадскай супольнасці Беларусі ацэньваюць выбар і пазіцыю Бяляцкага з вялікай павагай і шанаваннем. І гэта яшчэ раз падкрэслівае, што беларус Бяляцкі мае сваю вызначаную місію праўды.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нацыянальнае свята — не бесцялесная ідэя

Калі ў час бунтаў, з якіх пачыналася французская рэвалюцыя, люд Парыжа 14 ліпеня 1789 г. пайшоў на Бастылію, ніхто яшчэ не ведаў, як крывава пакоцяцца ў будучыні падзеі, якія спачатку скінуць з трона ненавіднага Луі XVI і прывядуць да ўлады ўсёўладную паню Гільяціну, а пасля распаляць крыважэрны якабінскі тэрор, які паглынуў дзесяткі тысяч нявінных ахвяр. Аднак гэты дзень адзначаецца ў Францыі як нацыянальнае свята. Аб крывавых ценях, якія кладуцца на слушна ўжо мінулае кастрычніцкае свята можна было б сказаць яшчэ больш. Толькі праз гады аказалася, што славуты крэйсер „Аўрора" адыграў у рэвалюцыйных падзеях ролю прынамсі спрэчную, а штурм на Зімні палац, які пасля ўшаноўваўся паўсюднай пампезнасцю, не быў зусім спантаннай атакай рассерджаных петраградцаў — што савецкая гістарыяграфія параўноўвала да штурму на Бастылію — а звычайнай тузанінай пару дзесяткаў п'яных бальшавікоў з не вельмі геройскім атрадзікам абаронцаў пакінутага царом і яго світай палаца.

Нацыянальныя святы міфалагізуюць мінулае. За гэтым ідзе абмятанне гістарычнай памяці са спрэчных падзей. Нейкія факты вылучаюцца, іншыя спіхваюцца ў глыбкі цень. Бо і сама сутнасць свята, якое мае ў прадпасылцы яднаць народ, палягае на нейкім абагульненні, вядучым нярэдка да міфатворчых спрашчэнняў. Толькі што там, дзе ёсць спрашчэнні, там скрываюцца таксама глыбокія раны гісторыі. На жаль, гісторыя кожнай сучаснай дзяржавы не з'яўляецца выключна спадчынай аднаго народа, але ўсіх ейных грамадзян.

Падпісаная 14 чэрвеня 1922 г. пратэстацыйная нота польскага ўрада, накіраваная міністру замежных спраў савецкай Расіі Чычэрыну, абвінавачвала савецкія ўлады ў інфільтрацыі тэрыторыі беларуска-польскага памежжа ды падтрымцы партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі ў ваколіцах Белавежы, Гайнаўкі і Кляшчэль. Партызан абвінавацілі ў ноце ў падпальванні вакзалаў, забойствах паліцэйскіх, гвалтах і рабаўніцтве; савецкія ўлады — у дапамозе ім у выглядзе паставак зброі, грошай і ў маральнай падтрымцы. Не былі гэта неабгрунтаваныя абвінавачанні. Антыпольская партызанка ў нядаўна адроджанай Рэчы Паспалітай была для тагачасных улад нечаканасцю. Тым не менш — калі можна так сказаць — польская адміністрацыя „заслужыла" сабе на гэта. Рэстрыкцыйная нацыянальная палітыка, накіраваная супраць беларусаў, пражываючых ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводства, хутка прынесла нежаданыя вынікі. Узрасло нежаданне ў адносінах да Польскай дзяржавы. Тым больш, што Корпус аховы пагранічча, пры байкоце абавязку вайсковай службы беларускамоўнай моладдзю, пачаў арганізаваць на гэтай тэрыторыі сапраўдныя аблавы і пацыфікацыі. Мелі яны на мэце вылушчэнне са схованак прызыўнікоў і прымусовае ўключэнне іх у войска. Нярэдка даходзіла да пабояў і арыштаванняў ні ў чым невінаватых мужыкоў. Савецкая прапаганда не прамінула гэтае выкарыстаць. У шматлікіх лістоўках, перакінутых кантрабандай праз няшчыльную мяжу, заклікала жыхароў Гайнаўскага павета супраціўляцца ўладзе, як гэта называлі, буржуазных паноў. Беларуская моладзь стала амаль масава ўцякаць у Пушчу, дзе ад некалькіх гадоў дзейнічалі партызанскія партыі. Неўзабаве сталі яны немалымі збройнымі групамі. Аб маштабе з'явы сведчыць прыклад атрада „Мухі", які распараджаўся 500 збройнымі ў аўтаматы і пісталеты людзьмі, коньмі і грашыма. Вявалі ў ім маладыя людзі з Гайнаўкі, Белавежы, Трасцянкі, Нарвы, Тыневіч і Адрынок. Іншы атрад — „Бацькі" — дзейнічаў у ваколіцах Кляшчэль. У яго шэрагах апынуліся хлопцы з Дубіч-Царкоўных, Маліннік, Сакоў, Залешан і Чаромхі.

Партызанскі рух на абшары Белавежскай пушчы развіваўся да 1926 года. У выніку вострых дзеянняў улад арыштавана было больш за 150 партызан. Шмат з іх пакаралі шматгадовай турмой, многіх — смерцю. Расстрэльвалі іх адразу пасля вынясення прысуду.

Я далёкі ад якіх-небудзь інсінуацый, ды лічу, што ніякае нацыянальнае свята не з'яўляецца толькі бесцялеснай ідэяй. А паколькі яно не бесцялесная ідэя, дык і ран на ёй знойдзецца шмат. Можна паставіць пытанне, хто аб гэтым мае памятаць. Па-мойму — усе грамадзяне.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

ІНП не адпусціў

Пракурор беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці Агнешка Русіловіч патрабавала адмены ліпеньскага судовага рашэння першай інстанцыі, значыць, беластоцкага Акруговага суда, які палічыў, што дэпутат Яўген Чыквін падаў у верасні 2007 г. (у папярэднім скліканні парламента) згодную з праўдай люстрацыйную заяву. Апеляцыя ў гэтай справе разглядалася 3 лістапада перад беластоцкім Апеляцыйным судом. Калі чытаеце гэты нумар „Нівы", мабыць, ужо ведаеце яго рашэнне, паколькі на яго суд вызначыў сабе час аднаго тыдня. У час каля паўтарагадзіннага разбору бакі ў судовым пасяджэнні спасылаліся на аргументы, парадстаўляныя ў час папярэдніх разбораў, якія працягваліся больш за два гады. Пракурор Русіловіч у гэты раз абгрунтоўвала:

— Суд [Акруговы — М. Х.] аднёсся выбарачна і павярхоўна ды прытым да некаторых доказаў. Абгрунтаванне гэтага рашэння не дазваляе на знаёмства з ходам абмяркоўвання разбору.

Патрабуючы, каб справа вярнулася да суда першай інстанцыі, пералічыла яна м.інш. факты, што „акругоўка" не дапусціла доказнага матэрыялу, якім быў кіруючы прынцып (інструкцыя) былога начальніка IV дэпартамента Службы бяспекі (займаўся ён сочкай за касцёламі і канфесійнымі саюзамі ды згуртаваннямі), а ў якім можна вычытаць — як заявіла пані пракурор — што таксама Яўген Чыквін, як старшыня ў васьмідзесятыя гады беластоцкага аддзела Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ) быў сакрэтным супрацоўнікам.

Абаронца дэпутата Кшыштаф Чашэйка-Сахацкі сцвердзіў, што ўспомненая пракуроркай інструкцыя адносілася да сямідзесятых гадоў, а Яўген Чыквін узначальваў мясцовае ХГЗ з 1982 г. (ідзе гаворка пра тое, што службы бяспекі цікавіліся Яўгенам Чыквіным ужо ў 1977 г., аднак сакрэтным супрацоўнікам меў ён стаць на пачатку лістапада 1983 г.; няма аднак дакумента наконт гэтага факта, пацверджанага ягоным подпісам).

— Заява пракурора ІНП была, далікатна гаварыўшы, кепска падрыхтаваная, абапіралася м.інш. на фальшывым дакуменце і без дапушчэння сведкаў, якіх пан Чыквін хацеў паклікаць. У гэтай справе не маем дачынення з сукупнасцю доказаў, што люстраваны падаў фальшывую люстрацыйную заяву, — гаварыў заступнік Чашэйка-Сахацкі.

Сам дэпутат Чыквін паўтарыў тое, аб чым запэўніваў ад першага разбору перад Акруговым судом:

— Я не быў сакрэтным супрацоўнікам ніякіх службаў ані ў ПНР, ані ў непадлеглай Польшчы. Не падпісваў ніякай заявы і не прымаў ніякіх заплат. Зацікаўленне маёй асобай службаў бяспекі, таксама службаў бяспекі СССР, было звязана з маёй грамадскай дзейнасцю.

І яшчэ раз адзначыў:

— Гэты разбор паказвае глыбокую паталогію ў ІНП і сярод яе функцыянераў. Не цікавіць мяне іхняя праўда аб дзеяннях служб, якія былі робленыя ў адносінах да мяне і майго асяроддзя.

Сярод — як гэта яшчэ раз акрэслілі — паталогій ІНП мела быць знішчанне дакументаў, перадаваных з Установы дзяржаўнай аховы ў ІНП, ды незахоўванне ў сакрэце інфармацыі аб уражлівых даных яго супрацоўнікаў (гаворка пра іх веравызнанне і нацыянальнасць). Дадаў:

— У час разбору перад Акруговым судом я выяўляў шэраг маніпуляцый і злоўжыванняў ІНП. Чаму адпаведныя органы маўчаць наконт гэтай справы? Адзінай мэтай гэтай апеляцыі з'яўляецца працяг стану абвінавачання, у які ІНП паставіў мяне як дэпутата перад грамадскай думкай. Сённяшнія функцыянеры ІНП усхваляюць былых „бяспечнікаў". Іхнія ацэнкі прадстаўляюцца як святая праўда, а мая асоба, якая ў пашане маецца перад грамадскай думкай, дэзавуіруецца.

Каб не быць абвінавачаным правасуддзем у спробе маніпуляцыі, у момант пісання гэтага тэкста, калі не прагучала ў справе дэпутата Чыквіна канчатковае судовае рашэнне, не магу сабе дазволіць на каментар.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Вакальны калектыў з вёскі Чаромхі 14 кастрычніка г.г. выступіў у Баброўцы. Справа: Надзея Внучка, Анна Боцюк, Марыя Кердалевіч, Яўгенія Кердалевіч і Валянціна Дудэль

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Спявачкі з Чаромхі

Вакальны калектыў у вёсцы Чаромсе заснаваны быў у 1981 годзе. У тым жа годзе было ўведзена ў Польшчы ваеннае становішча, што на кароткі час прыпыніла дзейнасць групы. Былі таксама і іншыя перапынкі ў гісторыі калектыву, але тры жанчыны з першага складу Марыя Кердалевіч, Анна Боцюк і Надзея Внучка здолелі пераадолець усе выпрабаванні. На працягу 30 гадоў удала спявалі яны песні са свайго сяла. Нядаўна выступілі з дзвюма малодшымі сяброўкамі Валянцінай Дудэль і Яўгеніяй Кердалевіч у Баброўцы. У размове перад гэтым выступам успомнілі яны пра пачаткі калектыву і трыццацігадовую дзейнасць. А выступалі яны і на Беласточчыне, і па-за нашым рэгіёнам. Часта ўдзельнічалі ў фестывалі „Беларуская песня", адкуль вярталіся з узнагародамі. У першапачатковым перыядзе сваёй дзейнасці менавіта там мелі найбольш зручную нагоду, каб паказацца шырэйшай публіцы. Выступалі таксама на шматлікіх беларускіх мерапрыемствах, арганізаваных Беларускім грамадска-культурным таварыствам, многа спявалі на гмінных імпрэзах. Пазней жанчын з вёскі Чаромхі сталі запрашаць на ўкраінскія мерапрыемствы. Усюды выступалі з мясцовымі песнямі. Калі сталі выступаць з абрадавымі пастаноўкамі, абапіралі іх на мясцовую традыцыю і сваю мову, якую ад пакаленняў захоўвалі іх продкі.

— Спеў жанчын з вакальнага калектыву з вёскі Чаромхі заслугоўвае самай высокай ацэнкі. Прэзентуюць яны абсалютна аўтэнтычны і вельмі багаты песенны матэрыял з асаблівай мелодыкай, які неабходна зберагчы ад гібелі. Калі раней я слухаў іх спеў, заўважаў вельмі выдатныя і чыстыя іх галасы ў сэнсе прэзентавання народнага спеву, якія рэдка можна было сустрэць, — заявіў выдатны знаток фальклорнага спеву Сцяпан Копа. — Я запісаў ад калектыву з вёскі Чаромхі вельмі многа песень і можна было б выдаць спеўнік, але дзеля гэтага павінна быць зацікаўленне гмінных улад. Калі я адзін раз спаткаўся з жанчынамі з гэтага калектыву, яны спявалі і спявалі мне ўсё новыя песні ўвесь вечар і ажно да другой ці трэцяй гадзіны ночы і толькі тады я заявіў ім, што ў мяне няма ўжо сіл, каб далей запісваць такое багацце іх фальклору. Калі, напрыклад, жанчыны паказвалі абрад „Каравая", пры кожным яго дэталі спявалі новыя творы.

— Прапанова заснаваць калектыў выйшла ад Янкі Крупы. Мы любілі спяваць і згадзіліся. Спадар Крупа быў таксама першым нашым інструктарам, — сказала Люба Салінская.

— У першым складзе калектыву спявалі дзве Анны Кердалевіч, Ліда Кердалевіч, Надзея Внучка, Анна Боцюк, Люба Салінская, Вера Панасюк і я, — пералічыла Марыя Кердалевіч. — Выступалі мы ў Беластоку, Гайнаўцы, Бельску, Мельніку, Заблудаве і ў розных сёлах. Калі мы выступалі з абрадамі „Каравай", „Прадкі", ці паказвалі прадстаўленне „Вячоркі", выступала з намі Галіна Саўчынская. Тады апякаваўся намі Міхась Вішанка, які ездзіў з намі ў розныя вёскі. Пабывалі мы тады з прадстаўленнямі, між іншым, у Літвінавічах, Малочках і іншых сёлах. Памяць ужо не тая, якая была раней, каб успомніць усе назвы вёсак. Наша гміна давала нам машыну для выезду і прафінансавала куплю ўбораў. Але строі ўжо замалыя на нас і таму цяпер выступаем у сваёй вопратцы. Папярэдні войт Міхал Врублеўскі добра да нас ставіўся і дапамагаў. Цяперашні войт Юрый Шыкула таксама дае нам транспарт і, спадзяемся, што таксама будзе дапамагаць.

— Мы вельмі хацелі спяваць, ездзілі і выступалі з нашымі песнямі. Спачатку я таксама ездзіла на сустрэчы ў БГКТ, дзе нас абучалі наконт грамадскай дзейнасці, — сказала Надзея Внучка. — Пасля Янкі Крупы працавалі з намі Міхась Вішанка, Сцяпан Копа, а Галіна Саўчынская дапамагала рыхтаваць абрадавыя пастаноўкі. З цягам часу па розных прычынах нашыя кабеты сталі адыходзіць з калектыву і склад меншаў.

На фестывалі „Беларуская песня" жанчыны з вёскі Чаромхі, выступаючы са сваімі даўнімі песнямі, займалі прызавыя месцы.

— Інструктары казалі, што мы спяваем вельмі прыгожа і прасілі нас спяваць на сваёй мове. Калі мы былі маладымі, *файна* было, але і цяпер хочацца ў кампаніі пабываць, цягне да спеву. Але здароўе ўжо не такое, як было раней, бо мне ж больш за восемдзесят гадоў, — сказала Люба Салінская, якая спявала ў калектыве ажно да апошняга перапынку. Калі аднасяльчанкі зноў вярнуліся на сцэну, не выступае з імі, але таксама і не адраклася ад калектыву ды можа яшчэ заспявае з сяброўкамі.

Жанчыны ўспаміналі таксама выступы на ўкраінскіх мерапрыемствах у Сопаце, Бельску, Луцку на Украіне.

— Мы спяваем на мове сваёй вёскі. Па-ўкраінску мы ніколі не спявалі. Але сталі нас запрашаць на ўкраінскія мерапрыемствы, то ездзілі. Я лічу сябе беларускай і ў час апошняга перапісу запісалася беларускай, — заявіла Марыя Кердалевіч. — У нашым рэпертуары многа вясельных і веснавых песень, мала, напрыклад, хрысцінных твораў. Жніўных песень мы ўвогуле не развучвалі, бо за нашай памяці іх у нашым сяле ўжо не спявалі.

— Найбольш песень ведала пакойная ўжо Анна Кердалевіч. Спявала яна вядучым голасам у групе. Мы да яе дастасоўваліся, — сказала Люба Салінская.

Пазней вядучым голасам стала спяваць Марыя Кердалевіч, у якой таксама багаты песенны рэпертуар.

— Я спявала з моладасці. Моладзь у нашай вёсцы перад вайной была расспяваная. Збіраліся маладыя на лавачках і многа спявалі. Спявалі таксама на прадках. Я ведаю многа песень. Развучвала іх ад сваёй мамы, бабулі, цёткі і іншых вяскоўцаў, калі спявалі ў кампаніі, — расказвала Марыя Кердалевіч. — Кіраўнік Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбара Самасюк паспрабавала падыгрываць нам на акардэоне, але з акампанементам нам не атрымалася. Нам трэба было павысіць тэмп спеву, а мы ж спяваем па-свойму, павольна, і таму выступалі без акампанементу.

Жанчыны з вёскі Чаромхі з выступаў вярталіся з рознымі ўзнагародамі, а адзін раз нават посуд атрымалі.

— Аднавіць дзейнасць пасля апошняга перапынку запрапанавала нам Барбара Самасюк. Мы з ахвотай прынялі прапанову, — заявіла Надзея Внучка. — Мы ж любім спяваць і быць у кампаніі. Выступаем са сваімі песнямі на мерапрыемствах і слухаем выступленні іншых выканаўцаў.

У Баброўцы з калектывам выступілі дзве новыя спявачкі, якія нядаўна сталі прыходзіць на рэпетыцыі.

— Апошнім часам мы выступалі ў Бельску, Чаромсе і Баброўцы. Яўгенія Кердалевіч выступіла з намі ўжо некалькі разоў, а Валянціна Дудэль першы раз спявала перад публікай у Баброўцы. Ім трэба яшчэ падцягнуцца і будуць спяваць так як мы, старэйшыя жанчыны, — сказала Марыя Кердалевіч, радуючыся, што малодшыя могуць падмяніць старэйшых.

— Валянціна Дудэль родам з Дашоў і таму ёй трэба крыху падвучыцца нашаму напеву, які крыху розніцца ад дашоўскага, — заявіла Надзея Внучка.

— Перад перапынкам у нашай дзейнасці мы спявалі ў Гайнаўцы на „Сустрэчах з праваслаўнай калядкай" і на гмінных мерапрыемствах. Зараз мы спяваем таксама ў царкоўным хоры ў вёсцы Чаромсе, найчасцей у час паховінаў, бо царква стаіць на могілках. Запрашаюць нас таксама ў царкоўны хор у пасёлак Чаромху, але мы туды ўжо не ідзем, — гаварылі жанчыны з калектыву.

— Я думаю, што нашыя жанчыны будуць выступаць з калектывам надалей. Я гавару ім, каб мяне ўжо не бралі з сабой, бо ў мяне баляць ногі. Аднак дапамагаюць мне ўвайсці па лесвіцы на сцэну, і хочуць, каб я яшчэ з імі выступала, бо ведаю многа даўніх песнь і голас у мяне добры, — заявіла Марыя Кердалевіч.

— Мы хочам спяваць і будзем яшчэ выступаць. Прадбачваем спяваць і прэзентаваць нашыя песні, каб яны не зніклі і каб вёска Чаромха не была забытай, — сказала Надзея Внучка, якая лічыцца кіраўніком калектыву. — Я збіраюся ў бліжэйшы час зайсці ў гміну і паразмаўляць наконт дзейнасці нашага калектыву.

Хто паклапоціцца?

27 кастрычніка падарожнічаў я рэйкавым аўтобусам з Чаромхі ў Беласток. Кампанію састаўляў мне пенсіянер-чыгуначнік Васіль Маркевіч з Дабрывады.

— Добра што спаткаў цябе, — загаварыў прыяцель. — Ад нейкага часу пратоптваю дарожкі па гайнаўскіх установах ды прашу, каб прадоўжылі лінію аўтобуса гарадской камунікацыі № 2, які курсіруе з-пад шпіталя пад чыгуначны віядук. Справа ў тым, што прыхварэлыя людзі і старэчы, каб зайсці ў цягнік, вымушаны адолець ступенькі трох'яруснага віядука. Для іх гэта вялікая праблема. А аўтобус мог бы заехаць на станцыю. Хапіла б праехаць кіламетровы прамежак з-пад віядука, праз чыгуначны пераезд на вакзал. І праблема была б вырашана. Але гайнаўскія чынушы ў адміністрацыі гарадскога транспарту як і ў Гарадской радзе, спасылаюцца на эканоміку. Кажуць, што не хапае грошай. А ці мы, падаткаплацельшчыкі, не дакідаем цаглінкі на іх утрыманне? Усё ж такі з нашых падаткаў вылучаюць зарплаты працаўнікам-бюджэтнікам. Ці не так?

— Прабаваў я хадайнічаць у старосты Гайнаўскага павета, — працягваў суразмоўца. — Але гэты адаслаў да бурмістра. Намеснік начальніка горада бездапаможна развёў рукі: „нічога не паможам, — канстатаваў гэты, — не можам датаваць". І кола замыкаецца. Народ церпіць. Ці так павінны ставіцца абраннікі народа да сваіх выбаршчыкаў?

Такая ж праблема і з аўтобусамі ПКС. Паколькі ліквідавалі білетныя касы і касіраў, дык аўтобусы даязджаюць адно да кругавой развязкі. Адтуль трэба цялепацца падарожным на вакзал да цягніка. І апошняя справа. Шафёры лініі № 2 не дбаюць пра спалучэнне з цягнікамі. Для іх усё трын-трава, што хтосьці на цягнік не паспявае або аўтобус чалавеку з-пад носа ўцячэ...

У народзе кажуць: „Сыты галоднаму не спагадае". Гэта святая праўда. Але іншая мудрасць напамінае, што „як Бог Кубу, так Куба Богу" адплаціцца. Варта затым падумаць дэпутатам Гарадской рады ды адказным кіраўнікам гайнаўскага самаўрада перад чарговымі выбарамі.

Уладзімір СІДАРУК

Падарункі пенсіянерам

Апошнім часам пенсіянеры з невысокай пенсіяй раз у год атрымліваюць ад дзяржавы харчовую дапамогу. Раённы аддзел Саюза пенсіянераў у Нараўцы налічвае каля 400 членаў, якія гэтай восенню атрымалі больш за 9 тон спажывецкіх прадуктаў, такіх як мука, крупы, макароны, кансервы, цукар, збожжавая кава. Усе вельмі задаволеныя такімі пачкамі. Шэсцьдзесят членаў Саюза пенсіянераў пад кіраўніцтвам Ядвігі Карпюк арганізавалі ў кастрычніку вечарынку, якая адбылася ў прасторнай і цёплай ляўкоўскай святліцы.

Елі, пілі, весяліліся, танцавалі пад музыку Пятра Скепкі. Былі таксама песні, вершы і жарты. Было шумна і весела. Хто не прыйшоў, той няхай шкадуе, тым больш, што гмінны аўтобус прывозіў і развозіў пенсіянераў па гмінных мясцовасцях.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Люблін адчыняе браму (3)

У час Кангрэса культуры Усходняга партнёрства ў Любліне (аб якім пісалі мы ўжо ў двух папярэдніх нумарах „Нівы"), прысутная была дэлегацыя прадстаўнікоў незалежнай беларускай культуры. Уважліва прыслухоўваліся яны кангрэсавым дыскусіям. Вось што м.інш. аб сваіх спадзяваннях ад Кангрэса расказалі „Ніве" некаторыя з іх.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Беларускі філосаф і пісьменнік **Валянцін Акудовіч**

Севярын Квяткоўскі і Ігар Логвінаў (справа)

Севярын Квяткоўскі з Беларусі, каардынатар праекта „Будзьма", што займаецца падтрымкай беларускай тоеснасці:

— Я спадзяюся, што выпрацаваныя на Кангрэсе высновы могуць вызначаць новыя шляхі і варыянты працы ва ўмовах недэмакратычнага грамадства. Прадстаўляюцца тут краіны з розным узроўнем свабоды, нават са свабодай больш абмежаванай чым у Беларусі. Краіны з большымі правамі чалавека, ці больш дэмакратычнымі, могуць паказаць, з якімі праблемамі змагаюцца. Памылкай з'яўляецца думка, што сітуацыя ў Беларусі нагадвае сітуацыю, у якой была Польшча ў васьмідзесятыя гады. Нічога падобнага. Я хачу гэта патлумачыць прысутным тут прадстаўнікам свету культуры.

Адказваючы на наша пытанне, ці культура можа функцыянаваць без палітыкі, адказаў:

— Без палітыкі можна функцыянаваць у сябе дома: можна пісаць раман, вершы ці маляваць карціну. Калі выходзіш з дому на вуліцу, дык ці калі таго хочаш ці не — ужо хоць бы ў адным працэнце сутыкаешся з палітыкай. Іншае пытанне, калі культура робіцца прапагандысцкім сродкам. Культура без гэтага можа функцыянаваць, але калі напішаш раман і пытаюцца ў цябе пра твой погляд на свет, нясеш палітычную адказнасць.

Прытым дадаў:

— У плане культуры, на маю думку, Лукашэнка з'яўляецца прымітыўным чалавекам і для яго культура гэта выключна агітацыйны, адукацыйна-прапагандысцкі сродак. Карыстаецца ён шаблонам савецкага часу. Тое, што бачым час ад часу ў тэлебачанні ці тэатрах, гэта выкарыстанне савецкіх штампаў. Для яго Беларусь у сэнсе культуры гэта вясковы фальклор. У закрытым грамадстве няўрадавыя арганізацыі вядуць несанкцыянаваную дзейнасць і гэта трактуецца як злачынства. І гэтую сітуацыю трэба тлумачыць людзям з Захаду, можа менш з Польшчы. Тлумачыць словамі, што ёсць падпольнае жыццё ў Беларусі, якое не можа выбрацца на паверхню.

У сваю чаргу беларускі філосаф і пісьменнік **Валянцін Акудовіч** паставіў шматзначна гучаўшы тэзіс:

— Для мяне Кангрэс гэта вялікая „інтрыга" і не ведаю, што з яе вынікне. Паколькі стаіць пытанне, чым мае быць супольнасць культуры. Пытаюцца ў мяне часам, ці ёсць штосьці такое як сусветная літаратура. На маю думку, гэта надалей толькі сума розных літаратур. Павінна яна, аднак, ствараць штосьці якраз агульнасусветнае. Гэтага не робіць, паглынае толькі найлепшае з паасобных літаратур. Гэтае самае датычыць культуры агулам. Па-над паасобнымі культурамі можа быць толькі масавая культура. Гаворка тут не пра арганізацыю нейкіх мерапрыемстваў у рамках ЕС ці УП, але пра стварэнне супольных каштоўнасцей, якія пусцілі б у рух працэсы ў кожнай паасобнай культуры. Добра, што кожны пасля гэтага Кангрэса зможа штосьці ўзяць з беларускай, грузінскай ці армянскай культур, але ці ўзнікне штось больш?

Успамінаючы аб самой праграме УП, заявіў:

— Праект УП быў важнейшы для Беларусі, чым для іншых краін гэтай праграмы, да 19 снежня мінулага года [прэзідэнцкія выбары ў Беларусі, пазнейшыя пратэсты і пераслед, між іншым турэмныя пакаранні прадстаўнікоў апазіцыі — М. Х.]. Мне здавалася, што УП будзе першым крокам да з'яднання Беларусі з ЕС. Аказалася ў чарговы раз, што ўлада ў Беларусі антыбеларуская таксама ў плане культуры. Я думаў, што дзякуючы УП беларуская ўлада адступіцца хоць крыху і культура зачэрпне дыху. Дзякуючы УП Беларусь магла наблізіцца да дэмакратычных краін. На жаль, нічога з гэтага не атрымалася. Лукашэнка сваім жорсткім разбоем 19 снежня ды пасля і да гэтай пары пакінуў сябе па-за Еўропай. Добра, аднак, што не зусім зачыніў за сабою дзверы. Вельмі праўдападобнае, што гэтая тэндэнцыя ў якой Беларусь кіруецца да Захаду, будзе аднаўляцца. Без Захаду ані ён, ані ўся Беларусь не можа функцыянаваць, нават ва ўмовах збліжэння з Расіяй.

Ігар Логвінаў, незалежны беларускі выдавец, меў надзею:

— Я лічу, што пасля Кангрэса ўзнікнуць новыя ідэі, новыя праграмы, наладзяцца новыя кантакты. Наша выдавецтва мае ўжо кантакты за мяжой, ды хочам далей развіваць іх на Усход.

Аб выдавецкай сітуацыі ў Беларусі пасля 19 снежня сказаў:

— Ад гэтай даты наша выдавецкая сітуацыя была ў жалюгодным стане. Пакуль, аднак, нейкіх крайне благіх дзеянняў у адносінах да нас няма. Пакуль можна працаваць.

І дадаў, што гэтак адбываецца незалежна ад апошніх канфліктаў з праўладным Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

Пастулаты Кангрэса маюць быць цяпер апрацаваны і сабраны ў адным дакуменце, які ўзнікне да канца года. Будзе ён адрэкамендаваны перш за ўсё Еўрапейскай камісіі.

Пачаеў са святой гары

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Белы конь і нелегальныя папяроскі (3)

Кажуць, найбольш спакушае ў святым месцы.

Хоць набліжалася дзевяць гадзін вечара, у мястэчку Пачаеве, вядомым з-за цудатворных ікон і святынь, панавалі яшчэ рух і гандлёвы настрой. Мы адразу пацягнуліся да манастыра, які здалёк прыцягваў увагу сваім раскошным асвятленнем. У кастрычніцкай цемры будынкі са шпілямі здаваліся крэпасцю, ахрышчанай імёнамі *Слава* і *Багацце.*

Калі мы ўздымаліся на святую гару, у твар павеяў халодны вецер, неадчувальны ўнізе.

— Вам *нельзя*! — пераступіў дарогу паліцыянт у форме, што стаяў у браме.

Ахоўнік правапарадку загадаў набыць у манастырскай краме спадніцу і хустку. Спадніцу, калі што, можна надзець на штаны. Нічога, што знізу будуць тырчэць галіфеты. А хустку, найлепш белую, каб выглядала як файная *жынка*. Інакш *нельзя!* Бабусі прагоняць за мур...

Той сімпатычны дыялог, перапоўнены хрысціянскім клопатам, папоўніла яшчэ адна сцэна. Непадалёк хістаўся п'яны мужык. Ён брыдкасловіў у бок асветленых цэркваў і махаў на халодным ветры вялымі рукамі, быццам сіліўся перамагчы якісь прывід. Паліцыянт не рэагаваў. Ці не нябесным сілам пакінуў ён вырашаць апошнюю праблему?!

* * *

На самай справе, мы зайшлі ў манастыр спытаць пра гадзіны багаслужбы, каб ведаць як арганізаваць свой час. Прысутнасць паліцыянта ў браме і гардэробны рэжым паказваў, што цягам апошніх пяці гадоў нішто не памянялася. Як і раней у Пачаеве багаслужбы адпраўлялі па маскоўскім часе. Першая літургія пачыналася ўжо ў чатыры раніцы. На мяжы мы падагналі на адну гадзіну гадзіннік, таму „чацвёртая" для нас была „трэцяй", карацей, той крытычны момант ночы, калі дзіка хочацца спаць.

У падобных выпадках лепш зусім не лягаць у ложак.

На нізе, значыць, на галоўнай вуліцы мястэчка, паўз белай сцяны манастыра бурліла жыццё. Хоць набліжалася дзевяць гадзін вечара, усюды працавалі магазіны, пакоі з гульнявымі аўтаматамі, піўныя бары і забягалаўкі. Адчувалася, што ў мястэчка амбіцыі метраполіі, „якая ніколі не засынае".

Спачатку мы пайшлі ў „Маркет" за пакупкамі, а пасля накіраваліся ў дом Надзі, што знаходзіцца ў падножжы святой гары. Па дарозе мінулі мініяцюрны рэстаранчык, дзе якраз зладзілі танцы. Дакладней, на паркеце кружылі дзве пары. Тое, што ў звычайных месцах здавалася б натуральным і прыгожым, тут выглядала на правакацыю. Усё з-за бландзінкі, якая надзела сукенку з аголенымі плячамі...

Сто метраў далей скончыліся тратуар, святло і ўся местачковая забава. Нейкі адрэзак дарогі мы дабіраліся па мяккім асфальце, у якім страглі абцасы і адбіваліся ўзоры на нашых падэшвах. Смярдзела смалой. З глыбі панадворкаў выляталі сабакі і па прывычцы заядла брахалі, як у вёсцы. Нягледзячы на егіпецкую цемру і калюгі ў завулках, мы адразу трапілі куды трэба, значыць, у дом Надзі Дэнісюк.

* * *

— Хіба прыйдзецца ўсё кінуць і ў вашу Польшчу з'язджаць, — Надзя не крыла расчаравання ўкраінскім урадам і парадкамі ў краіне: — Вы бачыце які ў нас крымінал?!

Апошні каментар датычыў судовай справаздачы з працэсу былой прэм'ер-міністр Юліі Цімашэнкі. Гэта быў першы і галоўны ньюс 11 кастрычніка 2011 г. Гэтую інфармацыю мы чулі ад рання, найперш па польскім радыё, пасля ва ўкраінскіх маршрутках і па тэлебачанні. У першым выпадку чалавек абураўся, слухаючы ўкраінскіх медыяў, схіляючыся думаць пра правасуддзе. Павітаўшыся з Надзяй, якая стаяла ля печкі і апалонікам мяшала апенькі ў вялікім катле, мы прысталі як у час калядавання ля парога, у куртках, каб разам з гаспадыняй паглядзець апошнія, доўгачаканыя навіны.

— Вы бачыце які ў нас крымінал?! — паўтарала Надзя. — Ну, проста разбой у белы дзень, на простай дарозе...

Інфармацыя выглядала прыблізна так: тэлебачанне паказвала сумную прэм'ер-міністр, якая сядзела на лаве падсудных у атачэнні паліцыі, мужа і дачкі. Пасля слова ўзяў малады суддзя Кірэеў, які, не хаваючы задавальнення, гаварыў пра шкодныя рашэнні абвінавачанай у 2009 годзе, у выніку якіх дзяржаўнае прадпрыемства Нафтагаз панесла страты на 1,5 мільярда грывень (200 мільёнаў $). Далей ішоў канчатковы прысуд: сем гадоў турмы, забарона на тры гады займаць дзяржаўныя пасты, вярнуць у казну паўтара мільярда грывень. Для Цімашэнкі далі сказаць адно палову сказа: *Прысуд суда ў маёй справе гэта патаптанне Канстытуцыі...* Другую палову дэфармавалі тэлевізійныя перабоі. Тэлеаварыя не дазволіла даказаць першай канкурэнтцы Януковіча, што яе працэс *вярнуў краіну да сталінскага тэрору 1937 года.*

Пра палітычны характар працэсу гаварылі прадстаўнікі Еўрасаюза і Расіі...

— Бачыце, — гаварыла і плакала наперамен узбударажаная і абураная Надзя, у прыватнасці вялікая прыхільніца Юліі Цімашэнкі, — нават Масква ў яго справядлівасць не верыць!

Пад словам „ён", як не цяжка здагадацца, скрываўся сам прэзідэнт Украіны, той самы, які прывітаў нас з рэкламнага шчыта ля няслаўных валынскіх аблагоў... *(працяг будзе)*

У цэнтры Пачаева

Манастыр у Пачаеве

УВАГА КОНКУРС

XIV Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIV Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група**: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група**: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIV Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **20 лістапада 2011 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2011 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

СПАЧУВАННЕ

Віктару СТАХВЮКУ

яго с'ямі і родным словы спачування з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці маці

АННЫ

выказваюць сябры з беларускага радыё Рацыя, тыднёвіка „Ніва" і літаратурнага аб'яднання „Белавежа"

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Шэры-шэры верабейка

(пішуць вучні)

Даўным-даўно былі на свеце толькі два колеры: шэры і чорны. Нават сонейка было шэрым, а ўсе дрэвы — чорнымі. Сумна і маркотна было ў такім лесе. Тут і птушкі не сявалі, ды і ўсе яны былі непрывабныя.

У такім вось лесе жыў верабейка Том. Кожную раніцу птушкі ляталі ў лясную школу, а верабейка Том прапускаў заняткі, бо любіў паспаць. І вось аднае раніцы ў сумны, маркотны лес завітаў мастак. Ён пачаў размалёўваць дрэвы, кветкі, птушак. З радасці птушкі весела засявалі і сваімі спевамі разбудзілі верабейку.

— Што гэта за музыка? — запытаў Том у малінаўкі, якая прыбыла позбач. — І чаму ты такая прыгожая?

— Мяне размаляваў мастак, а сяваць я пачала ад радасці, — весела адказала малінаўка. Махнула крыламі — і паляцела...

Верабейка Том усхапіўся і паляцеў шукаць мастака. Але мастака нідзе не было.

І так застаўся верабейка шэрым, а замест песні ў яго выходзіць толькі адно чырыканне. Восенню многія птушкі адлятаюць на поўдзень, верабʼі ж не ляцяць, бо ўсё чакаюць таго мастака, які калісьці так прыгожа размаляваў дрэвы, кветкі, птушак...

Марыся Красоўская
ПШ Капашкевічы, Гомельская вобл.

Бельскія беларусачкі

Фота Ганны Кандрацюк

Вершы Віктара Шведа

Няшчасце і шчасце

Запыталіся жанчыну:
— Як цяпер жывецца сыну?
— Сын мой вельмі нешчаслівы,
Жонка сталася лянівай.

— А што з вашаю дачкою,
Стрэла шчасцейка зямное?
— Маем залатога зяця,
Выручае яе ў працы.

Услужны шафёр

З колам змагаецца жанчына.
Раптам спыняецца машына,
Шафёр прыходзіць з дапамогай,
Такіх цяпер ужо нямнога.

— Я дзякую сардэчна пану
За так вялікую пашану.
Ды працаваць мы мусім ціха,
Прачнецца муж і будзе ліха.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: Агнешка Петручук (ПШ у Нарве).
2. Твой любімы прадмет: беларуская мова.
3. У жыцці хачу стаць: спявачкай.
4. У сяброў цаню: сяброўства.
5. Не люблю: ляноты.
6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй Лідай і дзядулем Янам, з настаўніцай беларускай мовы.
7. Кніжка, якая мяне захапіла: няма пакуль такой кніжкі.
8. Падабаецца мне музыка: дыска-пола.
9. Твае ўлюбёныя стравы: галубцы, якія робіць мама.
10. Твой любімы спосаб адпачынку: спяваю ўсё песні і мелодыі, якія прыходзяць у голаў.
11. Калі дарасту хачу жыць: яшчэ не ведаю.

Міра ЛУКША

Жоўты ліст

Сярод старых папер
знайшла я ліст на падстрэшку,
Адкрыла зжоўклы канверт,
раскрыліла ліст той без спешкі.
Ад „Зоркі" сяброўка была,
З Алма-Аты Наташка.
Дружба была, ды... сплыла,
Гады прамінулі як казка.
Пісалі. Цяпер інтэрнэт
паможа мо штосьці адновіць?
Стаў меншым вялікі свет.
Ды самае моцнае слова.
Мы зорчыных мелі сяброў,
Па свеце раскінутых цэлым.
Мо адрас напішам свой зноў?..
Каб тыя лісты нам ляцелі?

№ 46 [13-11-2011]

Фота Ганны Кандрацюк

Едуны з беларускага садка

Музыка з кайфам

Алег Хаменка

Добра, калі музыка, лепш, калі са словам!

Музыка стварае новы свет. Працуе нашае ўяўленне. Зусім незвычайна працуе, калі гэта класічная творчасць. Тады мы так блізка казак, легендаў, чароўных аповесцей, прыхаваных паміж радкамі нотнага запісу. Інакш успрымаем музыку са словамі. Аўтар нам сваю аповесць накідае, музыку чытаем разам са словамі, ацэньваем на колькі адно з другім супрацоўнічае. Бывае, што маем музыку і словы, а да гэтага яшчэ расказ выканаўцы. Словы тады ў перавазе, але ёсць і канцэпт! Бываюць сярод нас слухачы, якія прыходзяць на канцэрты менавіта таму, што любяць, калі спявак, вакаліст, выканаўца паміж песнямі не тое, што з намі гаворыць, а будуе нейкі расповед, часта перадуманы і запланаваны, а прынамсі паслядоўны. Гэта майстэрства. Бо, па шчырасці кажучы, калі не маеш таленту загаварыць ці зачапіць, лепш спявай і не адзывайся, калі няма такой патрэбы.

Маем пару такіх таленавітых гаваркіх артыстаў. Да гэтага расповеду натхніла мяне якраз прэзентацыя Алега Хаменкі з гурту „Палац", які выступіў нядаўна са сваім праектам „Казачная акустыка". Хто бачыў гэты менскі канцэрт, звяртаў увагу на цікавую слоўную афарбоўку. Увогуле цэлы праект пачаўся з пачутай Алегам Хаменкам гісторыі пра салдата-лекара. З таго моманту збіраў ён іншыя народныя аповеды і ў выніку стварыў сваю візію народнай філасофіі, якую прэзентуе пры ўдзеле акустычнай музыкі, блізкай творчасці гурту „Палац".

Выканаўцам, які прыцягвае публіку з-за сваёй акцёрскай падрыхтоўкі, з'яўляецца гарадзенец Віктар Шалкевіч. Ён будуе расказ на два спосабы. Можа быць гэта пры дапамозе чаргі песень, якія ўкладаюцца ў нейкую гісторыю, як гэта цудоўна зрабіў у час апошняй „Бардаўскай восені", але часцей за ўсё атмасферу будуе пры дапамозе жартаў, якімі падводзіць песні.

Выдатным і любімым публікай казачнікам з'яўляецца таксама Зміцер Вайцюшкевіч. Сёння цяжка сабе ўявіць яго выступ без своеасаблівай прапаганды, часам грамадска-палітычнай, але часцей сяброўска-застольнай. Бывае, што асноўнай структурай выступу Зміцера падаецца якраз расповед, а дадаткам — песні. Але вядома, што творчасць Вайцюшкевіча заўсёды вартасная і проста спрыяльная вуху.

i_basovka@o2.pl

Легенда пра пераможны меч

Кожны народ стварае свае міфы, легенды і казкі. Легенды — жывы твор. Яны перасякаюць межы сваёй айчыны і часам становяцца ўласнасцю шырэйшай грамады. Так адбылося з кельцкімі легендамі пра славутага караля Артура, якія ў XII стагоддзі набылі пісьмовую форму і вокамгненна заваявалі Еўропу. Адным з самых яркіх помнікаў беларускай літаратуры XVI стагоддзя, твор „Трышчан і Іжота", пабудаваны на кельцкай легендзе, звязанай з каралём Артурам...

Сёння раскажам пра чарадзейны меч Экскалібур, дзякуючы якому народ пабачыў у асобе збраяносца валадара і свайго абаронцу.

У кельцкіх легендах усё пачынаецца з чараў. Шаснаццаць стагоддзяў назад, у княстве Корнуол скончылася панаванне царскай дынастыі. Краіну ахапілі знішчальныя, братазабойчыя войны. У змрочны час прыходзіць на свет хлопчык. Усё дзякуючы чараўніку Мерліну, духоўнаму апекуну кельтаў. Хлапец жыве і дарастае ў замку свайго дзядзькі Гектара. Ён не ведае пра свой царскі радавод ды прыслугоўвае збраяносцам свайму зводнаму брату Каю. Аднойчы ў замку адбываецца турнір. На двор з'язджаюцца рыцары з суседніх замкаў і каралеўстваў. Сярод ваяроў — зводны брат Артур. Ён пераможа трох рыцараў-канкурэнтаў. Натхнёны і ашаломлены поспехам дамагаецца яшчэ адной чаргі. У апошнім баі ломіць яго кап'ё. У вачах саперніка бачыць прыемную прагу помсты. У гэты крытычны момант Артур шукае якогась выхаду. Ён бяжыць у палац. Па дарозе бачыць вялікі меч у скале, заклепаны ў кавадла. „Каб толькі паспець", — думае пра ацаленне брата! Падбягае да зброі ў скале. Дабывае меч і вяртаецца на пляц. На трыбунах мёртвая ціш. Рыцары шэпчуцца між сабой. Яны ведаюць, што здарылася...

Артур не паспее дапамагчы зводнаму брату. У момант, калі дабывае меч, у саперніка Кая разрываецца сэрца. Але ніхто не святкуе перамогі Кая...

Бо ўсе, апрача аднаго Артура, ведаюць, што аб'явіўся іх законны кароль, нашчадак старой царскай дынастыі. На гэта паказаў меч Экскалібур. Экскалібур — дар ад таемнай Уладарыні Возера. Каб ратаваць кельцкі народ, яна прыказала чараўніку Мерліну, каб з дапамогай чараў закаваў яе меч у кавадла на скале. Кожны рыцар марыў дабыць чарадзейны меч. Ды тысячы спроб канчаліся нічым. А тут падбягае збраяносец і здараецца цуд!

Карацей, народ пабачыў у асобе Артура законнага нашчадка Корнуола. Пра яго ад стагодзяў вяшчалі друіды. І не памыліліся. Артур быў каранаваны на замку ў Камелот, і аб'яднаў каралеўства. Як кажа легенда, з дапамогай мяча ён перамог дванаццаць ваенных паходаў і пакарыў дванаццаць каралёў.

ЗОРКА

Конкурс пра восень (7)

Прывітанне сябры! У нас працяг восеньскага конкурсу. Сярод прапанаваных варыянтаў, пазначце правільныя адказы. Разам з адказамі, калі ласка, пазначце нумар конкурсу:

1. У якім урошчы на Падляшшы знаходзіцца пустэльня манаха Гаўрыіла:

а) у Крыначцы,
б) у Кудаку,
в) у Пяценцы каля Тапалян.

2. Які звер выступае ў гербе горада Беластока:

а) тур,
б) конь,
в) алень.

3. Як называецца турыстычны шлях на Падляшшы, які прадстаўляе драўляныя помнікі дойлідства і духоўную культуру (пазначаны інфармацыйнымі табліцамі на польскай і беларускай мовах), арганізаваны Звязам беларускай моладзі:

а) Дрэва і сакрум,
б) Дрэва і людзі,
в) Шлях зубра.

4. Якія птушкі застаюцца зімаваць на Падляшшы?

а) жураўлі,
б) вераб'і,
в) дразды.

Адказы дасылайце да 30 лістапада 2011 г. (найлепш па электронай пошце на адрас „Зоркі"). Тут разыграем цікавыя ўзнагароды: беларускія кніжкі і гульні. Рашэнне конкурсу № 5 за тыдзень.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 46

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 42:

Ігра, мох, сказ, вуж, грошыкі, крыжаванка, лысы, Об. Кіт, печ, сом, кола, спор, імя, клас, грыбок, рыс, вожык, груша, Іна, жывот, Ас, каб, клін, пуп, дзева, чар.

Узнагароды, кніжку „Адукацыйныя вандроўкі" (фотаальбом з практыкаваннямі па падляшскіх ландшафтных парках) выйгралі **Наталля Нічыпарук, Юстына Якубюк, Вікторыя Артэмюк, Аляксандра Якуц, Патрыцыя Міхальчук** з Бельска-Падляшскага. Віншуем! Наш спонсар: Сувальскі ландшафтны парк.



„Цаглінкі” на вышыні артыстызму

Самадзейны калектыў „Цаглінкі” заснаваны быў Кастусём Майсенем у 1976 годзе ў Старым Ляўкове. Праз гэтыя гады калектыў аб'яднаў больш за 25 апантаных аматараў народнай песні. Гэта рабочыя і служачыя прадпрыемства будаўнічай керамікі ў Старым Ляўкове, работнікі медыцыны, настаўнікі, пенсіянеры, служачыя іншых прадпрыемстваў, якія надзелены добрымі прыроднымі галасамі, вялікай працаздольнасцю, што дазваляе ім дасягнуць высокага выканаўчага ўзроўню. Рэпертуар „Цаглінак” — разнастайны, песні розныя па характары і складанасці. Каштоўным скарбам „Цаглінак” з'яўляюцца беларускія народныя песні, а таксама песні іншых народаў. Творчы калектыў „Цаглінак” выявіў перад публікай сталы мастацкі густ, сваю выканальніцкую культуру і харавыя навыкі.

фота Міры ЛУКШЫ

Калектыў „Цаглінкі” любіць спяваць беларускія народныя песні. Калі я спытаў, якая любімая песня ў іх, мне адказалі:

— „Купалінка”. Калі спяваем гэтую песню, — прызнаюцца харысты, — то заўсёды ўяўляем тую дзяўчыну, якая „ружу поле, белы ручкі коле... кветачкі рве, вяночкі звівае, долю праклінае”. Мы ў час спеваў заўсёды ўяўляем перад сабою экран, на якім адбываецца тое, пра што гаворыцца ў песні і глыбока перажэнсоўваем тое, пра што спяваем.

Харысты сказалі мне яшчэ, што заняткі ў час рэпетыцый — гэта праца, а не гульня.

— І мы ўжо да гэтага прызвычаіліся... Песні — пастаянны наш спадарожнік у жыцці, — упэўнена гавораць яны.

Спадарожнічаючы „Цаглінкам” прыемны, пяшчотны, у нечым загадкавы голас баяна прыйшоўся да сэрца шматлікай публіцы. Мастацкі кіраўнік фальклорнага калектыву „Цаглінкі” і заадно баяніст Мікалай Мяжэнны — асоба творчая. Ён састаўляе праграмы для свайго калектыву, якія ні ў чым не паўтараюцца. Ён вядомы музыкант, вялікі аматар народнай творчасці, таленавіты чалавек. Мікалай Мяжэнны складае вершы, піша музыку, апрацоўвае народныя песні. Калі згадаць, што Мікалай Мяжэнны яшчэ і прапагандыст і асветнік у галіне народнага мастацтва, захоплены педагог, спецыяліст па музыцы, дык яму цалкам да твару будзе эксклюзіўнае званне баяніста-віртуоза і майстра харавога мастацтва.

Неабходна адзначыць, што дзякуючы намаганням і руплівасці дружнага калектыву шырока разгарнулі свае крылы „Цаглінкі”. Далікатныя, звонкія галасы і акампанемент баяна ўтвараюць сапраўдную гармонію, раскрываюць чароўны водгалас баяннага, шчымлівага гучання. Аўдыторыя ўспрымае гэта з асаблівым замілаваннем.

23 кастрычніка 2011 года, гадзіна 17:00. Зала святліцы ў Старым Ляўкове запоўнілася да апошняга месца. На 35-тую гадавіну дзейнасці „Цаглінак” прыбыло многа гасцей, у ліку якіх прадстаўнікі ваяводскага, павятовага і гміннага самаўрадаў, Генконсульства РБ у Беластоку, Галоўнага праўлення БГКТ, праваслаўнага і каталіцкага духавенства, журналісты радыё і друку, калектыў „Нараўчанкі”, дэлегацыя калектыву „Устроне” з далёкіх Скярневіц.

Натуральна, што адкрыццё ўрачыстасці выпала на долю войта Нараўчанскай гміны Мікалая Павільча. Адкрываючы ўрачыстасць, вельмі цёпла прывітаў ён гасцей, а таксама ўзнёслыя, сардэчныя словы выказаў у адрас юбіляраў — „Цаглінак”.

„Цаглінкі” занялі месца на сцэне. Нягледзячы на хваляванне, артысты выканалі сваю ролю паспяхова. Узрушылі яны залу сваім спеўным майстэрствам. „Цаглінкі” скарылі сэрцы ўсіх прысутных яркасцю і напоўненасцю гучання, пранікліваcцю і адухоўленым азартам. А ў кульмінацыі канцэрта калектыў узнёсся на новую вяршыню, выконваючы новыя, падрыхтаваныя на юбілей песні. У юбілейны вечар публіку, гасцей „Цаглінкі” захапілі новымі галасамі, майстэрствам ды проста абаяльнай прыгажосцю касцюмаў.

Шматкратна „Цаглінкі” ўдзельнічалі ў майстар-класах, выступалі на шматлікіх конкурсах, фэстах, фестывалях, дажынках, сустрэчах, калядных аглядах. Шмат разоў прадстаўлялі Падляшскае ваяводства на агульнапольскіх фестывалях. „Цаглінкі” ўдзельнічалі ў міжнародных прэстыжных фестывалях, іх канцэрты паказваліся па тэлебачанні, трансляваліся па радыё, асвятляліся ў прэсе. „Цаглінкі” заўсёды высока каціруюцца, а за сваё майстэрства атрымалі шэраг узнагарод, дыпломаў, кубкаў, ганаровых грамат.

У 2002 годзе „Цаглінкі” атрымалі Гран-пры і пераходны кубак мерапрыемства „Сеніярада” ў Беластоку. 18 верасня 2010 года занялі першае месца на агульнапольскім фестывалі ў Быдгашчы. У 2011 годзе на фестывалі беларускай песні занялі першае месца на павятовым аглядзе і другое — на ваяводскім.

Музычны кіраўнік калектыву „Цаглінак” Мікалай Мяжэнны таксама атрымаў шмат узнагарод, напрыклад, у 2004 годзе — дыплом міністра культуры РП Вальдэмара Дамброўскага за заслугі ў папулярызацыі і захаванні культуры беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, а 25 лютага 2011 года — медаль „Заслужаны для Гайнаўскага павета”. Кіраўніком „Цаглінак” з'яўляецца сімпатычная ўдзельніца калектыву Галена Барташук, якая таксама была ўзнагароджана дыпломамі і ганаровымі граматамі. Калектыў актыўна супрацоўнічае з фальклорнымі групамі з Польшчы і замежжа — з Украіны, Літвы, а перш за ўсё з Рэспублікі Беларусь, між іншым з Мінска, Гродна, Пружан, Свіслачы, Пінска, Брэста, Залесся, Смаргоні і іншых гарадоў.

У юбілейны вечар на адрас „Цаглінак” паступіла мноства пажаданняў, віншаванняў, сардэчных і цёплых слоў. Між іншым, ад міністра культуры і нацыянальнай спадчыны РП Багдана Здраеўскага разам з ганаровай адзнакай для калектыву „Заслужаны для польскай культуры”; ад маршалка Падляшскага ваяводства Яраслава Дважанскага; ад старшыні Галоўнага праўлення БГКТ у Польшчы Яна Сычэўскага і сакратар ГП БГКТ Валянціны Ласкевіч; ад старасты Гайнаўскага павета Уладзіміра Пятрочука і віцэ-старасты Андрэя Скепкі; ад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і намесніка міністра культуры Тадэвуша Стружэцкага; ад пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча праф. Віктара Гайсёнка; ад старшыні Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом „Радзіма” Максіма Дубянка і яго калектыву.

А вось тэкст віншавання ад Таварыства „Радзіма”:

Ансамблю „Цаглінкі”

Дарагія ўдзельнікі ансамбля „Цаглінкі”!

Паважаныя кіраўнікі і прыхільнікі яго творчасці!

Прыміце ад Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом „Радзіма” самыя шчырыя віншаванні з нагоды 35-гадовага юбілею.

За гэты час калектыў заваяваў сэрцы шматлікіх слухачоў і гледачоў як у Польшчы, так і ў Беларусі. Мы таксама мелі вялікае шчасце дакрануцца да Вашай творчасці і атрымаць найвялікшае задавальненне. Багаты і вельмі прыгожы рэпертуар, артыстызм і вялікае абаянне прыцягваюць публіку і не пакідаюць абыякавым нікога.

Сёння на святочных урачыстасцях, прысвечаных Вашаму юбілею, будзе гучаць беларуская музыка і песні ў Вашым выкананні. Упэўнены, што гэта дасць магчымасць тутэйшым беларусам адчуць еднасць і далучанасць да роднай зямлі, а ўсе, хто прыйдзе павіншаваць Вас, бліжэй пазнаюць культуру беларускага народа і атрымаюць вялікую асалоду ад Вашага мастацтва.

Жадаем Вам, дарагія „Цаглінкі”, невычэрпнай энергіі, творчых поспехаў, сямейнага дабрабыту і моцнага здароўя кожнаму з Вас.

З павагай старшыня Праўлення М. Дубянок і калектыў таварыства „Радзіма”

23 кастрычніка 2011 г. Мінск

Хачу падкрэсліць, што „Цаглінкі”, апрача пералічаных віншаванняў, атрымалі віншаванні і падарункі ад іншых арганізацый. Атрымалі яны таксама дзяржаўныя ўзнагароды — залатыя і сярэбраныя крыжы заслугі, вартасныя падарункі кожнаму члену і ўсяму калектыву ды мора кветак і пацалункаў.

Віктар БУРА, менеджар

Крыж каля вёскі Коцы-Піскулы

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Цехановец (2)

Афіцыйны гарадскі сайт Цеханоўца згадвае некалькіх людзей, асабліва заслужаных для горада, але няма ў ім згадкі пра найбольш слаўнага ўраджэнца горада. А быў ім Аляксандр Чыжэўскі. Прыводжу вытрымкі пра яго з расійскіх інтэрнэтавых рэсурсаў: Александр Леонидович Чижевский родился 7 февраля (26 января по старому стилю) 1897 г. в местечке Цехановец Бельского уезда бывшей Гродненской губернии в семье кадрового военного — офицера артиллериста Л. В. Чижевского, человека незаурядного, с широким кругозором и изобретательским складом ума, — получившего в годы первой мировой войны звание генерал-майора. После Великой Октябрьской социалистической революции он перешел на сторону Советской власти и возглавил Калужские пехотные командные курсы. В 1928 г. Л. В. Чижевский был удостоен почетного звания Героя Труда Рабоче-Крестьянской Красной Армии. Прадед будущего великого ученого, Никита Васильевич, был потомком бежавшего из Польши в XVI веке графа Яна Казимира Чижевского. Никита Васильевич прожил 111 лет, участвовал более чем в ста сражениях, в знаменитом Итальянском походе русской армии, получил ключи от города Брешиа для передачи их А. В. Суворову. Близким родственником Чижевских был герой Крымской войны адмирал П. С. Нахимов. Кстати, отец Александра Чижевского — Леонид Васильевич — даже внешне был очень похож на знаменитого флотоводца. В 1913 году семья переехала в Калугу, и это обстоятельство сыграло немалую роль в становлении личности Александра Чижевского. Здесь состоялось его знакомство со знаменитым калужанином, отцом мировой космонавтики Константином Эдуардовичем Циолковским. Несмотря на существенную разницу в возрасте, у молодого Чижевского быстро установились теплые, доверительные отношения с маститым ученым. Затем, окончив в 1915 году училище, уехал в Москву, где учился в Коммерческом и археологическом институтах.

Был знаком с Буниным и Брюсовым. С детства писал стихи, выпустил в Калуге два поэтических сборника: «Стихотворения» (1915) и «Тетрадь стихотворений» (1919), а также трактат «Академия поэзии» (1918). В 1916 г. Чижевский ушёл добровольцем на фронт. Был награждён солдатским Георгиевским крестом. Однако, воевал недолго — был ранен, получил контузию и был демобилизован. В 1917 году окончил археологический институт и защитил диссертацию на тему «Русская лирика XVIII века». В 1918 году представил на историко-филологический факультет Московского университета и защитил диссертацию на степень доктора всеобщей истории «Исследование периодичности всемирно-исторического процесса», которая спустя шесть лет была изложена в книге «Физические факторы исторического процесса». Теория Чижевского выражалась в следующем: он заметил, что циклы солнечной активности проявляют себя в биосфере, изменяя все жизненные процессы, начиная от урожайности и кончая заболеваемостью и психической настроенностью человечества. В результате, это отражается на конкретных исторических событиях — политико-экономических кризисах, войнах, восстаниях, революциях и т.п. Таким образом, Чижевский стал доктором наук в 21 год. А в 24 он стал профессором Московского Археологического института. В 1925 году он получил в Москве комнату в шесть квадратных метров, где и жил до 1931 года. Ко всему прочему, Чижевский был не только одаренным поэтом, но и незаурядным художником-пейзажистом. Известно, что он написал более ста картин, которые продавал, а средства от продажи шли на проведение научных опытов. Urodzony na Podlasiu uczony przeanalizował 25 wieków historii ludzkości. Wynik to stworzona przez niego historiometria — nauka o zależności wszelkich znaczących wydarzeń w dziejach od jedenastoletnich cykli aktywności słonecznej. Jest również twórcą biologii kosmicznej, znanej też jako heliobiologia — nauki o zależności życia i zdrowia człowieka od aktywności słońca. Jeszcze w 1919 roku odkrył, że dla optymalnej przemiany materii w organizmach roślinnych, zwierzęcych i ludzkich jest niezbędna optymalna ilość ujemnych jonów tlenu. W 1937 zorganizował Laboratorium Aeronifikacji przy zarządzie budowy moskiewskiego Pałacu Rad. Pierwsze jonizatory powietrza jego konstrukcji miały podnosić wydajność pracy o 15-20 proc. i zmniejszać zachorowalność robotników o jedną trzecią. Tzw. „żyrandol Czyżewskiego" stosowano też w szpitalach. Dzięki niemu poprawiał się stan zdrowia 80-90 proc. pacjentów. Ta sama metoda pozwalała ponoć — jeśli wierzyć sowieckiej propagandzie — zwiększyć o 25 proc. przyrost wagi zwierząt hodowlanych i udojów mleka, zaś kurom nieść się lepiej aż o 35 proc. За многогранную научную и художественно-литературную деятельность его называли «Леонардо да Винчи 20-го века». Работам Чижевского в области гелиобиологии и аэроионизации придавалось большое значение за границей. В сентябре 1939 года в Нью-Йорке состоялся Первый Международный конгресс по биологической физике и космической биологии, на котором А. Л. Чижевский был избран Почётным президентом. Чижевского приглашают в Америку, но в поездке за рубеж ему отказывают. Был направлен Меморандум о научных трудах Чижевского от имени конгресса в Нобелевский комитет, но обстановка в стране и отношение властей к нему были такими, что получить эту премию Чижевский не мог. Чижевский отказался от выдвижения на Нобелевскую премию «по этическим мотивам». Александр Леонидович Чижевский был репрессирован в 1942 г., заключён в лагеря в Свердловской области (Ивдельлаг) и в Казахстане (Карлаг, Степлаг), после освобождения в январе 1950 года отправлен на поселение в г. Караганду (Казахстан), в июне 1954 года освобожден от поселения, продолжая жить в Караганде. Dopiero w 1958 roku został ostatecznie zrehabilitowany i powrócił do Moskwy, gdzie kontynuował działalność naukową. Zmarł 20 grudnia 1964 roku. Został pochowany na moskiewskim cmentarzu Piatnickim. (Польскамоўныя цытаты з універсітэцкай газеты Шлёнскага ўніверсітэта ад чэрвеня 2001 года, дзе быў змешчаны артыкул калужскага прафесара Канстанціна Нікіфорава.)

Праваслаўны крыж на цехановецкіх могілках

З нобелеўскіх высот вяртаюся ў нашу падляшскую штодзённасць, у згаданую Буенку. Бадай у 1970-х гадах у „Ніве" быў змешчаны допіс выхадца з гэтай мясцовасці ў Беларусь і Буенка здалася мне з таго часу нейкай свойскай. Трыццаць гадоў таму здаралася мне праязджаць цераз гэтую вёску, распаложаную на трасе між Гайнаўшчынай і Варшавай; запамятаўся мне няроўны брук там. Сёння ў Буенцы асфальт, таксама няроўны. А на адной з клуняў модна вісяць сімвалы баярскай спадчыны — два хамуты і дуга...

На дарозе ў Рудку паказаліся два бельскія пасажырскія аўтобусы, едучыя ў напрамку Цеханоўца, даючы мне прадчуванне іх вяртання ў напрамку Бельска. На аўтобусным прыпынку ў Рудцы раскладу аўтобусаў, вядома, няма; цяперашнія патомкі ці то баяраў, ці шляхцічаў, у адсутнасць колішніх яцвягаў змагаюцца цяпер з раскладамі. Ад чакаючай там падлеткі даведаўся я, што машына ў Бельск будзе цераз пятнаццаць-дваццаць мінут. Так і было, насуперак дэзінфармацыі на спадарожных прыпынкавых раскладах.

Барці ў цехановецкім музеі імя К.Клюка

Ілона КАРПЮК

Кіно на выхадныя

Кіно без героя як самурай без мяча. Можа прыцягне, але не сячэ. Пра звычайных-незвычайных герояў у кіно 28 кастрычніка гутарыў Дыскусійны клуб АБ-БА. Апрача творцаў дакументальнага кіно, сярод публікі, якая вельмі ахвотна распытвала пра працу з героямі ў час здымання фільма, аказаўся адзін з сыноў Аркадзя Леўшука з вёскі Ціванюкі. Міраслаў Леўшук, сын героя, фільм пра якога між іншым можна было паглядзець у час клубнай сустрэчы, ахвотна расказваў пра жыццёвую гераічнасць не толькі свайго бацькі: „Неаднойчы, будучы дзяцьмі, мы не маглі глядзець *Тэлеранэк*, бо да бацькі стаяла чарга вазоў і ён ладзіў кожнаму тэлевізар".

www.ab-ba.com.pl

Аркадзь Леўшук стаў героем фільма, калі пачулі пра яго беластоцкія фільмоўцы. Раней, некалькі гадоў таму, адшукала яго, даўняга карэспандэнта „Нівы", наша журналістка Міра Лукша. З шасцідзесятых гадоў пісаў ён вершы, якія друкаваліся ў нашым тыднёвіку. Быў ён таксама мясцовым вынаходнікам і „майстрам па рамонце гаспадарскай апаратуры". „Калі я купіў першы тэлевізар, толькі чакаў, калі сапсуецца, каб паглядзець, што там усярэдзіне", — кажа з экрана Аркадзь Леўшук. Мноства дэталяў да фільмавай біяграфіі дакінуў у час сустрэчы ягоны сын. Можна сказаць, што стаў ён яшчэ адным героем, асабліва тады, калі з памяці пачаў дэкламаваць бацькавы вершы. Можа і сам не чакаў такога зацікаўлення з боку сабранай публікі, якая ўголас падтрымала ідэю сабраць пад адну вокладку творчасць звычайнага-незвычайнага героя з Ціванюкоў, можа нават з кампакт-дыскам, на якім запісаны былі б гукавыя эксперыменты аўтара: „Тата часам ішоў у такі пакойчык, дзе стаяла машына для запісу, і ён там сам дэкламаваў творы, даваўляючы эфекты, напрыклад, гонг з пакрывак ад гаршкоў ".

Звычайных-незвычайных герояў можна было паглядзець таксама дзень пазней. Фільмы і герояў адабралі арганізатары ўнікальнага мерапрыемства „Фільмавае Падляшша атакуе". Дзевяты выпуск прынёс шмат неспадзяванак. Першай напэўна быў старшыня журы з майстэрскім імем Аркадыюш Якубік. Рэжысёр, вакаліст, а перш за ўсё акцёр, вядомы з выдатных польскіх кінакарцін „Вяселле" ці „Дом злы". Як звычайна агляд, які адначасова з'яўляецца конкурсам, прайшоў у дзвюх частках. У першай гледачы сустрэліся з аматарскім кіно, у другой — з прафесійным. Неспадзяванкай была адзнака журы, якая, здаецца, супала з меркаваннем публікі, што сёлета фільмы аматараў былі сапраўды цікавейшымі. Праўда, што катэгорыю называлі самі аўтары, падаючы заяўку на конкурс. Гэта падштурхнула старшыню журы папрасіць, каб захоўвалі яны большую дыстанцыю да сваёй працы.

„Фільмавае Падляшша атакуе" гэта небывалы агляд, які падтрымлівае перш за ўсё лучнасць кінамастакоў з Падляшшам. У конкурсе ўзельнічаюць фільмы з усёй Польшчы, аўтарамі якіх з'яўляюцца ўраджэнцы Падляшша. Кожны год у лік узнагароджаных трапляюць, напрыклад, выдатныя аўтары мульцікаў з-над Балтыйскага мора, бываюць і беластоцкія творцы. Каб падкрэсліць абсяг і ўмоўнае значэнне Падляшша, якое сёння можна атаясамліваць таксама не з геаграфічнай краінай, толькі з межамі Падляшскага ваяводства (у сэнсе культурнага развіцця нават варта гэта рабіць), спецыяльны прыз „AIR LULEK" атрымаў Марцін Паўлюкевіч, які анімуе фільмавую культуру на Сувальшчыне, каб гэтая зямля, як сказаў заснавальнік конкурсу Мацей Рант, не была „белай плямай". Ад імя свайго сябры, Андрэя Сідара, Марцін Паўлюкевіч узяў таксама ўзнагароду Гран-пры фестывалю (дарэчы, спрычыніўся ён таксама да ўзнікнення фільма як мантажыст). Журы без ніякіх сумненняў за найлепшы ў гэтым выпуску выбрала фільм „Такі лёс". На парозе сваёй хацінкі стаіць пажылы чалавек. З-па-за экрана гаворыць ён пра значэнне лёсу ў чалавечым жыцці. Побач хаткі стары чырвоны „малюх" (Fiat 126p) і вялікае дрэва. У фінале фільма бачым секвенцыю змен, мяняюцца поры года, поры дня, нязменна стаіць чалавек. Змястоўна і метафарычна, як у найлепшым кіно. Самотны герой Андрэя Сідара напэўна апынецца ў ліку незвычайных герояў, як, дарэчы, большасць тых, якія сталі тэмамі для фільмаў, нават гэтых не ўзнагароджаных. А былі імі, між іншым, варшаўскія медсёстры ці Барыс Валошын, адзіны чалавек, які засяляе сталіцу свету Вершалін, створаны грыбоўскім прарокам Ільёй. Дзякуючы шматбаковаму падыходу творцаў паўстае не толькі больш якаснае з кожным годам кіно, але ў пэўным сэнсе фільмавая хроніка Падляшша, бо акцыя „Фільмавае Падляшша атакуе" перш за ўсё падштурхоўвае маладых фільмоўцаў назіраць за сваім наваколлем і шукаць сродкі, пры дапамозе якіх змогуць выказацца на важныя тэмы сённяшняга і ўчарашняга дня, а часам нават будучыні.

http://ep-by.org

Ёсць у Мінску прыгожы парк. Называецца ён Севастопальскі. Да горада ў Крыме гэты лясны масіў беларускай прыроды мае такое ж дачыненне як і вуліца, ад якой перадалося парку гэтае імя — то-бок ніякага. Але гэтая выспа прыроднага краявіду праславілася на цэлую Беларусь тым, што мясцовыя жыхары там супрацьстаяць мясцовай уладзе знішчыць улюбёнае месца адпачынку. Як кожнае супрацьстаянне ўладзе гэтае таксама з'яўляецца праявай грамадзянскай актыўнасці, чаго так бракуе беларусам.

Абаронцы Севастопальскага парку актыўныя таксама і ў віртуальнай прасторы, аб чым сведчыць створаны імі сайт, што месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://ep-by.org**. Невядома чаму, але назвалі яны яго крыху дзіўнавата — „Еўрапейская перспектыва". Дзіўнавата, бо на сайце ніяк не тлумачыцца, што абазначае еўрапейская перспектыва для Севестопальскага парку. Разам з тым сайт варты нашай увагі, бо дае магчымасць пазнаёміцца з адной з нешматлікіх мясцовых экалагічных ініцыятыў у Беларусі.

Абаронцы парку вельмі баяцца, што ўлады правядуць праз яго аўтамабільную дарогу. „Удалае разьмяшчэньне парку ў блізіні да цэнтру горада робіць тэрыторыю парку аб'ектам сталых пасягальніцтваў з боку праўладных бізнэс-структураў. З канца 90-х гадоў было зроблена некалькі спробаў распачаць забудову парку. За час змаганьня за захаваньне Севастопальскага парку агулам сабрана больш за 3 тысячы подпісаў мясцовых жыхароў у яго абарону", — распавядаюць актывісты кампаніі „Абаронім Севастопальскі парк" на старонцы „Пра нас" у падрубрыцы „Праекты".

У цяперашні час, як сведчыцца на сайце, пагроза для парку ўзмацняецца тым, што генеральны план Мінска прадугледжвае правядзенне праз парк аўтадарогі — гэтак званага Трэцяга кола. Яе пабудова адкладзеная да 2020 года. „Якім будзе далейшы лёс Севастопальскага парку, залежыць ад нас з вамі. Толькі аб'яднаўшыся, мы зможам супрацьстаяць спробам незаконнага ўцягненьня тэрыторыі парку ў камэрцыйны абарот. Толькі грамадзянская салідарнасьць зьяўляецца самай моцнай зброяй у змаганьні за захаваньне Севастопальскага парку", — пішуць актывісты, запрашаючы далучыцца да іх і падаючы кантакты свайго каардынатара Віктара Янчурэвіча.

Зважаючы на галоўную старонку сайта прыходзіш да высновы, што актывісты нямала робяць дзеля дасягнення сваёй мэты. Яны і праводзяць круглыя сталы, прыбіраюць тэрыторыю парку, і таксама не цураюцца палітыкі. Так, напрыклад, яны ладзяць акцыі ў падтрымку палітзняволеных, у прыватнасці, праваабаронцы Алеся Бяляцкага.

Праўда, да сайта актывістам кампаніі „Абаронім Севастопальскі парк" рукі даходзяць не заўсёды. Відаць таму пустымі застаюцца такія рубрыкі як „Відэа", „Фотагалерэя", „Бібліятэка". Такія недапрацоўкі адбіваюцца і на наведваннях сайта. Калі звярнуць увагу на „Форум", то яскрава бачна, што праблемы Севастопальскага парку на сайце не абмяркоўваюцца зусім. Акрамя таго, навіны „севастопальскага змагання" ўжо больш чым за месяц не абнаўляюцца — нават звычайная справаздача аб намечаным на 1 кастрычніка ўпарадкаванні парку талакой не знайшла пакуль свайго месца на сайце. Няўжо загінула такая выдатная грамадская ініцыятыва?

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Дом Багдановіча

Сёлета восень выдалася надзвычай сухая і сонечная. Хіба з дзяцінства не магу прыгадаць, каб лістапад адпавядаў сваёй старажытнай назве — на многіх дрэвах па-ранейшаму ўбранне з пажоўкласчырванелага лісця, якое ўпарта трымаецца за сваё кароткае жыццё. Гарадзенская вуліца Першага Мая пры парку Жылібера адна з нямногіх у горадзе, дзе яшчэ прыемна шпацыраваць — рух аўтамабіляў тут неінтэнсіўны, а абапал ходнікаў шэраг адметных будынкаў. Вось старая абшарпаная лютэранская кірха, якая ніяк не можа дачакацца сваёй рэстаўрацыі. А вось ладна адрамантаваны з фасада і бакоў дамок колішняга, пасля першай сусветнай вайны прэзідэнта горада Эдварда Лістоўскага. Яшчэ далей камяніца, у якой некалі жыў знакаміты хормайстар Рыгор Шырма. А паміж імі сціплы будынак, які трывала ўвайшоў у гісторыю сучаснага беларускага адраджэння. Гэта Дом-музей Максіма Багдановіча. Вядома, што славуты паэт нарадзіўся ў Мінску, а калі яму было пару месяцаў, сям'я перабралася ў горад над Нёманам. „Жыў ён тут у анёльскім веку і застаўся светлым анёлам, што крыламі сваімі затуляе ад бруду і цемры" — як трапна выславілася літаратуразнаўца Ала Петрушкевіч. Сям'я некалькі разоў пераязджала ў розныя кватэры, але заўсёды выбірала жыллё на першым паверсе драўлянага будынка. У 1965-м годзе на згаданым доме з'явілася мемарыяльная дошка, а ў час перабудовы адчыніўся адпаведны музей.

У сярэдзіне васьмідзесятых гадоў ужо мінулага стагоддзя ў гэтым доміку, калі яго гаспадыняй, стваральніцай і першай дырэктаркай музея была паэтка Данута Бічэль-Загнетава, фармаваліся мясцовая беларуская думка і касцяк рэгіянальнага Беларускага народнага фронту, суполкай імя Багдановіча задумвалася і рэалізоўвалася самвыдатаўская газета „Рэанімова". Усяго выйшла дзесяць нумароў гэтай газеткі фармату А4, якая часткова рыхтавалася нават у Вільні, прывозілася адтуль і хутка разляталася ў беларускім асяродку Гародні. Паралельна ў доміку гуртавалася нефармальная арганізацыя — заходнебеларускае згуртаванне моладзі. Яшчэ пазней адзін з ініцыятыўных гарадзенскіх прадпрымальнікаў арганізоўваў тут сустрэчы мясцовай беларускай інтэлігенцыі. Вечарыны былі цікавымі, але з надыходам іншага часу зышлі на нішто. Мясцовыя ўлады, „кантралёры — злыя, хворыя, з бруку, з канторы", змянілі на пасадзе і дырэктарку Дануту Бічэль, якая прысвяціла музею вялікую частку сваёй душы. Гісторыя з яе звальненнем была непрыгожай і нават ганебнай. Наступніцы спадарыні Дануты наўрад ці разумелі, якая спадчына ім перайшла для працы, проста выконвалі свае „прафесійныя абавязкі". Нібыта і экспазіцыя засталася ранейшай, але знікла галоўнае. Музей застаўся адлюстраваннем мінуўшчыны, гісторыі літаратурнага руху, біяграфіі паэта, але перастаў злучаць нацыянальнае адраджэнне пачатку XX стагоддзя з сучаснай беларушчынай, нітаваць пераемнасць і традыцыю з сённяшнім днём як нешта жывое з жывым, вымяраць вечнае праз імгненнае і наадварот.

Сёння ў старажытнай Гародні, акрамя дома-музея Багдановіча, ёсць толькі магіла маці паэта Марыі, куды можна ўскласці кветкі. Яна па правым баку на ўваходзе старых праваслаўных могілак. І больш нічога, помнік вялікаму Максіму ў горадзе над Нёманам так і не паўстаў. Улада не любіць паэтаў, бо паэты не служаць уладзе. А для нас па-ранейшаму, кажучы словамі Дануты Бічэль-Загнетавай, „глядзіць у вочы Максім Багдановіч вачамі зоркі Венеры".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

З Махнатага, ад Алёшы Герасімюка, падаўся я да Грышы Мароза ў Старое Беразова. Вёскі мяжуюць з сабою. Калісьці салэцтва раздзяляў не больш чым паўкіламетравы прамежак дарогі, а мяжою быў чыгуначны пуць. Зараз Махнатае ад Старога Беразова раздзяляе адно табліца з назвай вёскі.

Паабапал асфальтавай вуліцы красуюцца прыгожыя мураваныя дамы. Да гэтага яркага пейзажу не падыходзіць змрочны цень парастаючага пустазелем і кустамі чыгуначнага прыпынку. І хоць чыгуначная лінія Гайнаўка — Беласток даўным-даўно знікла з карты, дарожны інфармацыйны знак (у выглядзе выклічніка і паравоза) напамінае аб яе існаванні. Старое Беразова гэта вялікая вёска. У ёй каля паўтары сотні гаспадарак. Так з боку Махнатага, як і па ўсёй вёсцы красуюцца шыкарныя дамы з задбанымі сядзібамі. Вось і знаёмы панадворак калегі. Лёгка сюды трапіць, бо Грышын дом зараз за аўтобусным прыпынкам. Прывітаў мяне гаспадар.

— Праходзь... Сам у хаце. Жонка з пілігрымкай паехала, — паясніў сябра, затым прыбавіў: — Манастыр ва Уйковіцах, куды падалася гайнаўская пілігрымка, збудавалі два манахі. Кажуць, быццам з Амерыкі прыехалі. Пасля таго, як сталі ўладальнікамі шматгектарнай гаспадаркі, у гаспадарчых будынках арганізавалі праваслаўную капліцу. Затым узнікла ідэя пабудовы манастыра на ўзгорку за вёскай. Нягледзячы на перашкоды з боку мясцовага каталіцкага насельніцтва, пабудову паспяхова ўдалося закончыць. Зараз туды падаюцца ў паломніцтва многія праваслаўныя вернікі, бо там знаходзіцца цудоўная ікона Ватапедскай Багародзіцы. Пасля гэтай інфармацыі абменьваемся навінкамі. Прапаную сябру аднавіць супрацоўніцтва з „Нівай".

— Пішы, не адкідайся... — заахвочваю.

Паколькі час мяне паганяў, бо да ад'езду цягніка заставалася няшмат часу, а да таго чакала мяне даўжэйшая размова з Мікалаем Яноўскім, рэкамендую прыяцелю зрабіць памятныя здымкі ў яго прыгожым агародчыку...

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Сустрэча ў Старым Беразове

Грыша Мароз

Дом Мікалая Яноўскага знаходзіцца непадалёк вясковага клуба. І хоць была нядзеля, гаспадара не застаў я ў хаце. Займаўся на панадворку гаспадарскімі справамі. Прывітала ягоная жонка Вера. Гэта сімпатычная, жыццерадасная жанчына. Калі я адрэкамендаваўся і выявіў мэту свайго падарожжа, гаспадыня сказала дачцэ паклікаць бацьку. Праз некалькі мінут з'явіўся і гаспадар. Перадаю здымак сябру, які зрабіў у час сустрэчы ў Чаромсе на беларускім фэсце. Затым, прад'явіўшы фатаграфію Алёшы Герасімюка з махнацкімі самадзейнікамі, прашу ўспомніць прозвішчы ўдзельнікаў драмгуртка са Старага Беразова. Мікалай без праблемы запісвае па чарзе ўсе прозвішчы.

— Ды і ў мяне захаваліся фатаграфіі з таго часу, — канстатуе прыяцель. Праз момант корпаецца ў дамашнім архіве і, знайшоўшы пажаўцелы здымак, гаворыць: — Гэта я выступаю з Сярожам Кучкам на сцэне ў Моры. Памятаю, што спяваў песню „Чорное море", а Сярожа падыгрываў на гармоніку. Гэта быў пачатак 1960-х гадоў. І зноў ажываюць успаміны з маладосці: супольныя вечарыны, падарожжы па наваколлі з пастаноўкамі ды турыстычныя экскурсіі па краіне ў рамках селькагаспадарчага навучання. У такой экскурсіі ў Пулавах я ўдзельнічаў у 1960 годзе з Грышам Марозам і Мікалаем Яноўскім.

Непрыкметна сцякае час пры сяброўскай размове і гасцінным пачастунку. Гадзіннік паказваў без пятнаццаці хвілін чатыры пасля абеду. Развітваюся з сімпатычнымі гаспадарамі і абяцаю, што неўзабаве спаткаемся. Тады прывязу здымкі з супольнай сустрэчы і „Ніву" з допісам аб гэтай падзеі.

Праз пятнаццаць мінут быў я ўжо ў Махнатым на панадворку Алёшы Герасімюка. Хуценька сябра пагрузіў мой ровар у аўтамабіль і, забраўшы з сабою ягоную жонку, падаліся мы ў Вітава. Зараз і рэйкавы аўтобус з Гайнаўкі ў Чаромху падышоў. Герасімюкі падаліся праз Дубічы-Царкоўныя ў Махнатае, а я ў Чаромху з надзеяй, што праз тыдзень зноў спаткаемся.

(працяг будзе)

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Сцяпана Нефідовіча.

1. кантынент з Кітаем = 115 _ 41 _ 43 _ 78 _;
2. агародная расліна сямейства бабовых = 24 _ 99 _ 26 _;
3. Васіль, аўтар „Альпійскай балады" = 45 _ 46 _ 80 _ 127 _ 79 _;
4. паўсядзённае жыццё = 69 _ 70 _ 66 _;
5. горад між Магілёвам і Рагачовам = 94 _ 95 _ 129 _ 130 _ 128 _;
6. літаратурнае прозвішча Самуіла Плаўніка = 133 _ 134 _ 135 _ 136 _ 29 _ 33 _;
7. стагоддзе = 81 _ 82 _ 86 _;
8. драўляная пасудзіна для замешвання цеста = 100 _ 101 _ 102 _ 103 _ 96 _ 97 _;
9. вайсковае падраздзяленне, якое ахоўвае дзяржаўную граніцу = 11 _ 12 _ 13 _ 14 _ 77 _ 74 _ 75 _;
10. старажытнагрэчаскі вярхоўны бог = 28 _ 27 _ 113 _ 17 _;
11. порт на поўначы Францыі = 92 _ 93 _ 126 _ 62 _;
12. „водпуск" у школьных занятках = 67 _ 68 _ 124 _ 123 _ 122 _ 125 _ 98 _ 25 _;
13. партнёр прадаўца = 38 _ 39 _ 50 _ 132 _ 131 _;
14. кашэчы драпежнік з грывай = 35 _ 36 _ 34 _;
15. валакністая расліна з блакітным квецем = 7 _ 9 _ 10 _;
16. збудаванне для пераезду цераз раку = 42 _ 106 _ 107 _ 108 _;



17. Уладзімір, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў = 44 _ 57 _ 63 _ 64 _ 40 _ 65 _ 16 _;
18. Эдэм = 73 _ 4 _ 5 _;
19. спічастая горная вяршыня = 3 _ 85 _ 88 _;
20. пінская рака = 56 _ 30 _ 84 _ 72 _;
21. прылада для аблівання цела = 116 _ 117 _ 104 _;
22. прадмет, рэч = 53 _ 51 _ 52 _ 54 _ 61 _;
23. важная фігура = 83 _ 59 _ 49 _.
24. рыцарская ахоўная зброя = 6 _ 60 _ 2 _ 1 _;
25. незвычайная фігура = 20 _ 21 _ 22 _ 58 _ 19 _;
26. дзіця без бацькоў = 71 _ 55 _ 109 _ 110 _ 37 _ 15 _;
27. вертыкальная частка будынка ў Быкава і Яновіча = 31 _ 32 _ 18 _ 23 _ 8 _;
28. частка Кітая з Лхасай = 118 _ 119 _ 47 _ 48 _ 105 _;
29. між гмінай і ваяводствам = 120 _ 121 _ 89 _ 90 _ 91 _;
30. наглядчык за працай сялян у памешчыка = 111 _ 112 _ 114 _ 87 _ 76 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 41 нумара

Кампост, Масты, Парыж, Случ, лоб, вочы, Пінск, ліга, вавёрка, рамка, борць, круча, Крынкі.

Рашэнне: **Словы ні прычым калі гавораць учынкі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

13.11 — 19.11

(22.03. — 20.04.) Да 14.11. пазбягай канфліктаў, бо можаш праваліцца; не пляці абычаго. 14-18.11. зоркі прынясуць матэрыяльныя поспехі. Аграмадныя залежы энергіі ва ўсім. Найбольш дасягнеш, дзейнічаючы на сваю руку. Свае ідэі будзеш ажыццяўляць дзве апошнія дэкады лістапада.

(21.04. — 21.05.) Да 20.11. добры час падпісваць дамовы, негацыяваць, але лепш не бяры пазык (увесь месяц). Цёпла апранайся, не пераборшчвай з кіслым. Досыць гвалтоўна можа быць у сямейных справах. З нейкімі справамі будзеш прымушаны справіцца ў адзіночку.

(22.05. — 22.06.) Ужо можаш адпачыць, ды і схочацца? Шмат энергіі, якую можаш выкарыстаць на пакупкі, рамонт (увесь месяц добры на перасяленні, перастаноўку мэблі). У пачуццях не адкладвай цяжкіх рашэнняў і вырашальных размоў. Калі старая справа зноў табе „не выстраліць", урэшце яе кінь. З сям'ёй можа быць цяжка знайсці супольную мову.

(23.06. — 23.07.) Будзеш яшчэ грашавіты, ды пачнеш таксама адкладваць. Азвецца твая рамантычная натура, ды лішне не фліртуй. Можа абмінуць цябе спадзяванае павышэнне (лепш будзе пад канец месяца). Магчымы трывожны вынік лекарскіх абследаванняў няхай цябе хутка пагоніць да лекара.

(24.07. — 23.08.) З 18.11. (да 22.11.) сваркі і непаладкі могуць знішчыць твае планы; не трымайся з людзьмі з некрыштальным іміджам. Вернуцца людзі з мінулага, з дзяцінства. З новымі — не ўсё зайграе. Можаш знайсці фірму, у якой даспадобы будуць твае кампетэнтнасць і індывідуальнасць. Тужэйшы кашалёк — у другой палове месяца.

(24.08. — 23.09.) 15-19.11. можаш не дагаварыцца з партнёрам; ахопіць цябе татальная лянота ды ўвесь час будзеш на кагосьці ці штосьці абражацца. Раз будзеш „да раны прыкласці", іншы — „без кія не падыходзь". Звычайна бязмежна ашчадны, гатовы будзеш выдаць усю зарплату на абы-што. Падумай пра асенні адпачынак.

(24.09. — 23.10.) 13-17.11. могуць паявіцца праблемы з людзьмі, з якімі мусіш неадкладна справіцца; трэба будзе падпарадкавацца камусьці, каго не любіш. Ды агульна добра ўкладзецца кампанейскае жыццё; прыхільнасць людзей. Не залюбляйся на першай сустрэчы, і не ўяўляй нічога пасля пару кампліментаў! Хоць мілае знаёмства можа развінуцца ў нечаканым напрамку.

(24.10. — 22.11.) Някепскае здароўе, ды прыдаўся б салідны трэнінг. Не рызыкуй стабільных і трывалых адносін для аднаразовай прыгоды. Можаш неабдумана даверыць людзям, з якімі лепш не мець дачынення. Можаш мець праблемы з перадачай інфармацыі. Зрабі парадак у сваіх паперах і стасунках; не мяшай працоўных спраў з прыватнымі. Партфель не будзе больш пукаты, ды можаш крышку зашалець.

(23.11. — 22.12.) Нагоды для знаёмстваў. Бывай у як найбольшай кампаніі. У другой палове лістапада з поспехам развінеш крылы ў кожнай галіне, без натугі і ў добрым настроі. Мноства атракцыёнаў. Да 15.11. будзеш вельмі крытычны, недаверлівы. Паправа ў фінансах.

(23.12. — 20.01.) Усё трымаеш пад кантролем. Не будзь лішне суровым у ацэнках. Не дасць табе спакою сям'я — бліжэйшая і далейшая. Змены ў кампанейскіх адносінах — хтосьці падвядзе, іншаму пазайздросціш ты. Без рызыкі няма ўдачы, а яна будзе мець выключна салодкі смак!

(21.01. — 19.02.) Не будзе нуды і застою. Ды не ўсім спадабаюцца твае шалёныя задумы. Мала хто цяпер паспее за табою. Пераканаешся, што ў каханні магчымае ўсё. Не панікуй, правер яшчэ раз даследаванні свайго здароўя. Еж больш гародніны, пі свежыя сокі, масуй ступакі.

(20.02. — 21.03.) Распірае цябе энергія, ды захавай асаблівую асцярожнасць (аж да 22.11.), можаш таксама моцна страціць настрой. Найлепшыя задумы прыйдуць табе без падрыхтоўкі. Выкараскаешся з фінансавых турбот. Цешся хвілінай і не думай, што будзе праз 10 гадоў!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Sprzedaż egzemplarzową „Niwy" prowadzą: kioski i punkty sprzedaży „RUCH" na terenie woj. podlaskiego oraz w Warszawie (odbiór należy zgłosić u sprzedawcy wybranego kiosku lub punktu sprzedaży „RUCH"), placówki pocztowe i listonosze w woj. podlaskim, siedziba redakcji „Niwy".
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.
Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Размова з Дзмітрыем Шатыловічам, паэтам і інжынерам

Дзмітрыю Шатыловічу — 85

Дзмітрый Шатыловіч (злева), Георгій Валкавыцкі, Васіль Петручук, Віктар Швед

фота Міры ЛУКШЫ

„Ніва": — *Як пачаўся Ваш кантакт з беларускім словам?*

Дзмітрый Шатыловіч: — Першы кантакт пачаўся ў 1939 годзе ў шостым класе Беларускай няпоўнай сярэдняй школы ў Бельску-Падляшскім. У чэрвені 1939 г. я закончыў шосты клас польскай пачатковай школы ў Чаромсе-Станцыі, а ў ліпені здаў экзамен у Чыгуначны тэхнікум у Бярэсці. Калі ў верасні 1939 г. Чырвоная Армія заняла ўсходнюю Польшчу, то ў кастрычніку пачаў працаваць Чыгуначны тэхнікум у Бярэсці і я там пачаў вучыцца. Я жыў у Бярэсці на кватэры і хадзіў пяшком у тэхнікум. Быў там 7 лістапада з вучнямі тэхнікума на парадзе, прымеркаваным да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, і бачыў на трыбунах разам з савецкімі вайсковымі прадстаўнікамі немцаў, якіх туды запрасілі, і аглядаў савецкія танкі. У некаторых танках папсаваліся тады гусеніцы і яны не маглі далей ехаць. Усе ўрокі ў тэхнікуме вяліся на польскай мове. Кожную суботу з сябрам па парце Антонам Ляшчынскім мы вярталіся цягнікам з Бярэсця ў Чаромху. Набіралі мы дома харчоў на тыдзень і ў нядзелю выязджалі на кватэру ў Бярэсце. Было нам цяжка і таму, калі пад канец лістапада мы даведаліся, што ў Бельску-Падляшскім узнікла Беларуская няпоўная сярэдняя школа, паехалі мы туды і дырэктар школы прыняў нас у шосты клас. У савецкіх школах узровень навучання быў вышэйшы, чым у польскіх, бо ў пятым класе былі ўрокі замежнай мовы (у нас — нямецкай), а ў шостым класе вучылі алгебры і планіметрыі. У школе былі ўрокі беларускай мовы. З Беларусі прыслалі нам беларускамоўныя падручнікі па многіх прадметах. Да чэрвеня 1941 г. я закончыў сёмы клас. Па многіх прадметах здаваў я экзамены на беларускай мове. Пасля, у час нямецкай акупацыі, калі немцы вывезлі мяне ва Усходнюю Прусію, траплялі мне беларускія газеты, якія выдаваліся ў Берліне.

Калі я 9 студзеня 1946 г., як дэмабілізаваны салдат Чырвонай Арміі, вярнуўся з Бабруйска ў Чаромху, мяне прынялі ў чацвёрты клас Беларускай гімназіі і ліцэя ў Бельску-Падляшскім. У чэрвені 1946 г. польскія ўлады ліквідавалі Беларускую гімназію і ліцэй і тады трэба мне было паступіць у польскі ліцэй імя Тадэвуша Касцюшкі ў Бельску-Падляшскім. Закончыў я яго ў чэрвені 1948 года.

— Вы адразу ўключыліся ў беларускі літаратурны рух, які стаў развівацца пры „Ніве" і былі пры пачатках „Белавежы". Вы былі на першым з'ездзе...

— Калі я закончыў Электратэхнічны інстытут у Ленінградзе ў снежні 1953 г., накіравалі мяне ад 1 сакавіка 1954 г. на працу ў якасці магістра-інжынера ў Энергетычнае праектнае бюро ў Варшаве. У 1956 г. я нечакана знайшоў газету „Ніву". Пачаў яе купляць і чытаць. І выслаў у рэдакцыю верш „Падляшша", які быў надрукаваны. Я раней пісаў вершы на беларускай і рускай мовах у школьныя насценгазеты ў 1940-1941 і 1946 гг. Калі надрукавалі мой першы верш, пачаў я высылаць іншыя вершы ў „Ніву". Іх друкавалі, мяне сталі запрашаць на літаратурныя семінары ў рэдакцыю. І так трапіў я на першы з'езд „Белавежы".

— Была праца, былі падарожжы і вершы?

— У 1975 г. я здаў экзамены на гіда замежных экскурсій і польскае турыстычнае бюро „Орбіс" пачало высылаць мяне ў час водпускаў і ў вольны ад працы час на замежныя экскурсіі з польскімі турыстамі, а з савецкімі — па Польшчы. Я тады меў права на 30 дзён працоўнага водпуску і дадаткова на 10 дзён водпуску для ветэранаў-франтавікоў. Тады пачаў я пісаць вершы з падарожжа і высылаць іх у „Ніву". Іх друкавалі і ў выніку атрымаўся зборнік „Эцюды падарожжа". Я з польскімі турыстамі аб'ехаў Крым, Каўказ. Быў два разы ў Баку, Тбілісі, раз у Ерэване, у Ташкенце, праехаў аўтобусам з Тбілісі ў Арджанікідзе (цяпер Уладзікаўказ) па Ваеннай грузінскай дарозе, быў у Турцыі, Грэцыі, Балгарыі Венгрыі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Малдавіі, адпачываў у Ялце, Сочы, Піцундзе, Сухумі, Батумі, Адэсе і ў многіх іншых гарадах. Не лічу Масквы і Ленінграда, дзе быў з турыстамі некалькі разоў. Працаваў я на электрастанцыі ў Тузле ў Югаславіі і ў Бакара ў Індыі. У Індыі жыў я амаль тры гады і пабываў у многіх гарадах. З савецкімі экскурсіямі аб'ехаў я многія гарады Польшчы. У Францыі быў я ў 1975 г. прыватна два тыдні з жонкай і дачкою па запрашэнні сваячкі маёй жонкі, унучкі царскага контрадмірала Анатолія Аляксеевіча Конанава, які ўцёк у Францыю ад бальшавікоў.

— Якія зборнікі выйшлі ў Вас за апошнія гады? Якія ў Вас планы — выдавецкія і іншыя?

— Да сённяшняга дня я выдаў 14 паэтычных зборнікаў (11 на беларускай мове і 3 — на польскай), якія можна знайсці ў інтэрнэце на сайце www.kamunikat.org. Пятнаццаты зборнік на беларускай мове знаходзіцца ў карэктуры. Хачу ў гэтым годзе яго выдаць. Мае вершы друкаваліся ў „Беларускіх календарах" выдаваных БГКТ, у альманахах, газетах і кніжных выданнях як у БССР, так і ў Рэспубліцы Беларусь. Мае творы ўвайшлі ў кніжку „Беларускія пісьменнікі Польшчы", мой верш надрукавалі ў зборніку „Верш на свабоду", які выдала радыёстанцыя „Свабода". Мае тры вершы пераклаў на рускую мову Генадзь Рымскі і ўвайшлі яны ў кнігу „Антология белорусской лирики XIX-XX веков". Мае вершы друкаваліся ў „Annus Albaruthenicus", у „Тэрмапілах". Надрукавалі іх у Нью-Йорку ў альманаху „Беларус-2010". Успаміны друкаваліся ў кнігах „У новай айчыне", „Пакаленне вайны" і „Час трывогі і надзеі", друкуюцца ў „Часопісе".

— Віншуем Вас з прыгожым юбілеем і жадаем далейшых плённых, здаровых і шчаслівых гадоў з беларускім словам.

Размаўляла Міра ЛУКША

Сакрат Яновіч і Дзмітрый Шатыловіч

фота Міры ЛУКШЫ

***ДЗМІТРЫЙ ШАТЫЛОВІЧ** нарадзіўся 8 лістапада 1926 г. у вёсцы Чаромха на Беласточчыне ў сялянскай сям'і. У 1939 г. скончыў 6 класаў польскай пачатковай школы ў Чаромсе-Станцыі і пасля, да чэрвеня 1941 года, вучыўся ў Бельску-Падляшскім у савецкай сярэдняй школе. У час нямецкай акупацыі ў сакавіку 1943 г. быў вывезены на прымусовую працу ва Усходнюю Прусію пад горад Гайльсберг. Пасля прыходу туды Чырвонай Арміі ў лютым 1945 г. быў прызваны ў яе рады і накіраваны на фронт. Пад канец лютага быў цяжка ранены ў левы бок і брыво левага вока ды перавезены ў вайсковы шпіталь у Зэебургу. Па дэмабілізацыі ў студзені 1946 г. вярнуўся з Бабруйска дамоў і паступіў у 4-ты клас Беларускай гімназіі ў Бельску-Падляшскім, які закончыў у чэрвені 1946 г. У сувязі з тым, што польскія ўлады ў жніўні 1946 г. ліквідавалі Беларускі ліцэй, здаў іспыты ў польскі ліцэй імя Тадэвуша Касцюшкі ў Бельску-Падляшскім, які скончыў у чэрвені 1948 г. Міністэрствам асветы быў накіраваны ў Ленінградскі электратэхнічны інстытут, які закончыў у снежні 1953 г., атрымаўшы дыплом магістра-інжынера электрыка-аўтаматыка. З сакавіка 1954 г. стаў на працу ў праектнае бюро ў Варшаве. Праектаваў цеплавыя электрастанцыі ў Польшчы і за мяжою. Быў паўгода на аўтарскім нагляде ў Тузле ў Югаславіі і амаль тры гады ў Бакара ў Індыі. У вольны ад працы час з 1975 г. працаваў гідам замежных экскурсій у турыстычным бюро „Орбіс" і іншых турфірмах.*

Вершы на беларускай, польскай і рускай мовах Дзмітрый Шатыловіч пачаў пісаць у 1940 г. У друку выступіў пад канец 1957 г. на старонках штотыднёвіка „Ніва", затым публікаваў у літаратурных альманахах, „Беларускіх календарах". Аўтар з'яўляецца сябрам Саюза польскіх літаратараў і ганаровым членам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Узнагароджаны Кавалерскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы, Сярэбраным крыжам заслугі і іншымі медалямі.

Дзмітрый Шатыловіч з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў, між іншым: „Эцюды падарожжа", „Маё Падляшша", „Хвалі часу", „Вясёлка над імглою", „Струмені лёсу", „Асеннія промні", „Гронкі надзеі", „Ліхтар уражанняў" і ў перакладзе на польскую мову „Rezonanse pamięci".

ISSN 0546-1960